Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гарному Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выдання—XV
№ 84 (3988)
ПЯТНІЦА, 27 САКАВІКА
1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

Перабудову прафработы— на вышэйшую ступень

Разгорнутае сацыялістычнае наступленне па ўсім фронце, барацьба за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады патрабуе ад прафсаюзаў далейшай перабудовы форм і мэтадаў работы, далейшага павароту тварам да вытворчасьці. Сутнасьць гэтай перабудовы заключаецца ва ўзмацненьні кіраўніцтва вытворчым жыцьцём прадпрыемстваў і пасобных груп рабочых, у кіраўніцтву ўсё ўзрастаючай актыўнасьцю рабочых вакол пытаньняў вытворчасьці, у перанясеньні цэнтру цяжкасьці прафработы на завод, у першапачатковую вытворчую групу, ва ўзмацненьні матар'яльнага і культурна-бытавога абслугоўваньня шырокіх мас рабочых.

Правыя апартуністы і «левыя» загібшчыкі не разумеюць адзінства задач прафсаюзаў у барацьбе за сацыялістычную рэканструкцыю, за разгортваньне вышэйшых форм сацыялістычнай арганізацыі працы з задачамі паляпшэньня матар'яльна-бытавога становішча рабочых. Яны супроцьстаўляюць вытворчыя функцыі прафсаюзаў абарончым, на разумеючы, што ПАЛЕПШАНЬНЕ МАТАР'ЯЛЬНАГА СТАНОВІШЧА РАБОЧЫХ АЖЫЦЬЦЯЎЛЯЕЦЦА ПРАЗ ВЫТВОРЧУЮ РАБОТУ, ПРАЗ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА, УДАРНІЦТВА, ПРАЗ ВЫКАНАНЬНЕ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНАЎ.

Партыя рашуча змагалася і будзе змагацца з усякімі спробамі апартуністаў затрымліваць ці звужаць тэмпы перабудовы прафработы.

У пленум УсеЦСПС на аснове вычарпальных паказаньняў XVI зьезду УсесКП(б) вызначыў разгорнутую праграму дзеяньняў па завяршэньні перабудовы прафсаюзаў у адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду.

З часу сканчэньня работ V пленуму, прайшло каля двух месяцаў. Прафсаюзы Беларусі пад кіраўніцтвам партыі дабіліся значных посьпехаў у рэалізацыі пастаноў пленуму. Перабудова работы, набліжэньне яе да вытворчасьці, новыя формы работы далі новыя посьпехі ў справе ўцягненьня шырокіх рабочых мас у сацыялістычнае будаўніцтва, у справе разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, у нарастаньні новага творчага парыву.

Аднак, трэба з усёй сілай падкрэсьліць, што патрэбных тэмпаў перабудовы прафработы па радзе саюзаў яшчэ няма. Ня ўзяты яшчэ сапраўды бальшавіцкі разгон.

Невыкананьне вытворчай праграмы нашай прамысловасьці (за студзень плян выканан на 91,6 проц., а за люты—на 78,8 проц.) — лепшы паказальнік таго, што прафарганізацыі яшчэ не перабудаваліся, што адсутнічае яшчэ ў многіх прафарганізацыях сапраўдная бальшавіцкая барацьба за прамфінплян.

Толькі апартуністычная базьдзейнасьць, недаацэнкай гістарычнай важнасьці пастаноў V пленуму можна вытлумачыць тое, што заўком ЧЫГУНА-ЛІЦЕЙНАГА ЗАВОДУ ІМЯ СТАЛІНА (БАБРУЙСК), ЗАЎКОМ ЗАВОДУ «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК» (ВОРША) ня толькі не прыступілі да рэалізацыі пастаноў пленуму, але і не папулярызавалі іх сярод рабочых.

РАЗБУЙНЕНЬНЕ САЮЗАЎ — асноўная ўмова павароту тварам да вытворчасьці — праводзіцца надзвычай марудна, пры чым яно не ў выстрчальнай ступені суправоджаецца масавай раслупмасальнай работай.

Ня гледзячы на тое, што ЦСПСБ абавязала ЦП саюзаў да 15-га лютага правесьці ход перабудовы, ні ў адным ЦП няма канкрэтных матар'ялаў па гэтым пытаньні.

У пленум УсеЦСПС у сваіх пастановах завастрыў увагу на пытаньні перабудовы ВЫТВОРЧЫХ НАРАД. Побач з правядзеньнем вытворчых нарад па цэхах, групах, брыгадах, яны павінны праводзіцца і па прафсэкцыях. Гэта мерапрыемства пры новай пастаноўцы прафработы будзе стымуляваць яшчэ большае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Усю важнасьць і мэтазгоднасьць перабудовы вытворчых нарад пацьвярджаюць першыя вынікі правядзеньня нарад ЛІЦЕЙШЧЫКАЎ у гор. Гомелі. Брак ліцейшчыкаў, які складаў у сярэднім 16 ПРОЦ., у выніку распрацоўкі канкрэтных мерапрыемстваў на вытворчых нарадах, зьнізіўся ДА 5 ПРОЦ. Трэба і тут падкрэсьліць, што далёка ня ўсюды яшчэ перабудавана работа вытворчых нарад, што слаба нападжана масавая работа сярод рбочых пасобных спэцыяльнасьцяй.

Максімальнае скарачэньне ПЛАТНАГА АПАРАТУ, шырокае прыцягненьне ДОБРААХВОТНІКАЎ — асноўны паказальнік сапраўднай перабудовы. Па гэтым пытаньні пленум даў выразныя паказаньні. Аднак, да гэтага часу справа прыцягненьня добраахвотнікаў да прафработы і сыстэматычная работа сярод іх у большасьці саюзаў не нападжана. Ёсьць нават рад выпадкаў апартуністычнага супраціўленьня рэалізацыі пастаноў аб прыцягненьні добраахвотнікаў да практычнай прафработы. Так, апартуністы ПЕТРЫКАЎСКАГА ГРУПКОМУ БУДАЎНІКОЎ з санкцыі райпрофбюро павялічваюць платны апарат, затраціўшы на яго ўсе сродкі культфонду і інш. мэтавых асыгнаваньняў. У той-жа час груба ігнаруецца дырэктыва аб вярбоўцы добраахвотнікаў. Такое становішча і на БАБРУЙСКІМ ДРЭВААПРАЦОЎЧЫМ КАМБІНАЦЕ, дзе заўком замест прыцягненьня добраахвотнікаў, настойліва ставіць пытаньне перад ЦП аб павялічэньні ліку платных работнікаў, якіх і так на камбінаце 17 чалавек. Ня лепш справа з выкарыстаньнем добраахвотнікаў і работай сярод іх у ЦП саюзаў. З усіх сэктараў ЦСПСБ толькі адзін сацыяльна-бытавы нападзіў работу сярод добраахвотнікаў.

Посьпех ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ — рашаючая задача. Бальшавіцкая падрыхтоўка да яе — важнейшае пытаньне сённяшняга дня. Праз шэфства на вытворчай асновы, праз канкрэтную дапамогу, праз рад другіх мерапрыемстваў прафсаюзы павінны аказаць дзейную дапамогу ў падрыхтоўцы да другой калгаснай вясны. Між тым, гэтая дапамога, гэты ўдзел прафсаюзаў у падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўнай кампаніі вельмі слаба, а ў шмат выпадках праходзіць самацёкам. Малё робіцца ў справе перанясеньня вопыту сацыялістычных форм працы заводаў і фабрык у калгасы і саўгасы. У гэтым напрамку пэўныя дасягненьні маюць рабочыя заводаў «ЭНЭРГІЯ» і «КАМУНАР». У выніку іх работы ў падшэфных калгасах і саўгасах Сьмілавіцкага і Капыльскага раёнаў, апошнія прадвілі сустрэчныя пляны веснавой сяўбы. Гэтую практыку трэба пашырыць на ўсе прадпрыемствы.

У пленум падкрэсьліў важнасьць разьвіцьця ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРАК у справе палепшаньня рабочага забесьпячэньня і павышэньня рэальнай заработнай платы рабочых. Пленум абавязаў прафсаюзы канкрэтна дапамагаць спажыўкаапэрацыі ў яе рабоце. НЯ ЎСЕ ПРАФАРГАНІЗАЦЫІ яшчэ зразумелі важнасьць гэтай работы. ГРАМАДЗКАСЬЦЬ ЯШЧЭ НЕ МАБІЛІЗАВАНА НА РЭАЛІЗАЦЫЮ ГЭТЫХ ПАСТАНОЎ.

РЭЧЫЦКІ, НАПРЫКЛАД, ГАРПРАФСАВЕТ замест дапамогі ў рабоце ЦРК па зборы мэтавых авансаў на разьвіцьцё прыгарадных гаспадарак, катэгарычна адмовіўся ад гэтага, правяўшы апартуністычную недазацэнку гэтага важнейшага пытаньня. У радзе месц яшчэ не адведзена зямля пад прыгарадныя гаспадаркі (ВІЦЕБСК і інш.), а прафарганізацыі стаяць у баку і не выяўляюць канкрэтных вінаватых зрыву арганізацыі прыгарадных гаспадарак.

ШЫРОКІ ДОБРААХВОТНЫ РУХ ЗА ПАВЯЛІЧЭНЬНЕ НОРМ ВЫПРАЦОЎКІ І ПАНІЖЭНЬНЕ РАСЦЭНАК, што абумоўліваецца самым сацыялістычным характарам нашай прамысловасьці, яшчэ не ўзначалены прафсаюзнымі арганізацыямі. Задача прафсаюзаў — ШЫРЭЙ РАЗГАРУЦЬ ГЭТЫ РУХ, ПАДНЯЦЬ ЯГО НА ПРЫНЦЫПОВУЮ ПАЛІТЫЧНУЮ ВЫШЫНЮ.

Арганізацыя ТРЫКУТНІКАЎ ПА ЗЬМЕНАХ, абслугоўваньне НАЧНЫХ ЗЬМЕН, ПЕРАБУДОВА КУЛЬТУРНА-МАСАВАЙ РАБОТЫ ўсё яшчэ праходзіць марудна. Трэба значна ўзьняць тэмпы работы ў ажыцьцяўленьні гэтых мерапрыемстваў.

Узмацняючы барацьбу з апартунізмам, разгортваючы шырэй хвалю крытыкі і самакрытыкі, узьнімаючы сацспаборніцтва і ўдарніцтва на вышэйшую ступень, змагаючыся за палепшаньне матар'яльна-бытавога становішча рабочых, за сацыялістычную рэканструкцыю вёскі, прафсаюзы пад кіраўніцтвам ленінскай партыі закончаць перабудову ўсёй сыстэмы работы ў адпаведнасьці з задачамі 3-га рашаючага году пяцігодкі.

ДА КАНТРОЛЬНАГА ТЭРМІНУ ПА КАНТРАКТАЦЫІ
БССР падыходзіць з ганебнымі лічбамі

Плян кантрактацыі яравых выканан у сярэднім толькі на 10 проц.

Кулак, карыстаючыся праваапартуністычнай практыкай некаторых нізавых арганізацый, прабуе сарваць важнейшае палітычна-гаспадарчае мерапрыемства

РУЙНУЮЧЫ УДАР ПА КУЛАКУ І ЯГО ПАМОЧНІКАХ—АПАРТУНІСТАХ І БЮРАКРАТАХ

Дабіцца рашучага пералому

Амаль 3 месяцы прайшлі са дня апублікаваньня гістарычнай адозвы партыі і ўраду аб кантрактацыі яравых пасеваў 1931 году. Час зусім выстарчальны, каб разгарнуць масавую растлумачальную і практычную работу па рэалізацыі гэтага важнейшага гаспадарча-палітычнага мерапрыемства.

Матар'ялы брыгадзіраў Наркамснабу БССР, якія выяжджалі ў раёны, сьвядчаць аб сур'ёзнай пагрозе выкананьню вызначаных пляноў кантрактацыі. На 20 сакавіка па тэхнічных культурах плян выканан усяго на 10,8 проц. Ня лепш і па іншых культурах.

У радзе раёнаў мясцовыя арганізацыі праяўляюць правы апартунізм на практыцы і ня прымаюць рашучых мер да забесьпячэньня выкананьня пляноў кантрактацыі. Растлумачальная і практычная работа па кантрактацыі ва многіх раёнах падмяняецца права-апартуністычнай стаўкай на самацёк.

У Асіпавіцкім, Спуцкім, Барысаўскім, Заспаўскім, Дубровенскім раёнах слаба разгорнута папулярызацыя і прапраўка адозвы на сходах калгаснікаў і бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў.

Да практычнай работы па кантрактацыі на мясцох прыступілі з вялікім спазьненьнем. Па Дубровенскім раёне плян у разрэзе сельсаветаў быў спушчан у канцы лютага, але ён ляжаў у сельсаветах бяз руху.

У Асіпавіцкім раёне кантрактацыю распачалі праводзіць механічна, без выстарчальнай масавай работы сярод беднаты. Некаторыя райкаапсаюзы абмяжоўваюцца падпісаньнем з упаўнаважанымі вёсак дагавораў, да якіх прыкладаюцца сьпісы разьмеркаваньня кантрактацыі па дварох. Дагавары гэтыя не прапрацоўваюцца на сходах сялян.

У выніку такога бюракратычнага падыходу да кантрактацыі, тэмп яе вельмі слабы. Па Дубровенскім раёне па аднаасобным сэктары на заканчэньне 10 м. 15 калгасаў закантрактавалі мізэрны процант пляну — усяго 400 гэкт. У Барысаве інспэктар гандлю Гольдзін замест работы займаецца «очковтирательством». Брыгадзіру Наркамснабу Гольдзін заявіў, што па раёне закантрактавана 30 проц. пляну, а пры праверцы аказалася, што калгасы закантрактавалі 19 проц., а як праходзіць кантрактацыя па аднаасобным сэктары, наогул невядома. У Хойніках ужэл спажывецкай каапэрацыі ў кантрактацыі вельмі нязначны. Мясцовая кантора Сакухлебу стаіць у баку ад гэтай важнейшай справы і нават ня ведае ўмоў кантрактацыі. Упаўнаважаныя, якія праводзяць кантрактацыю на мясцох, затрымліваюць дагавары ў сябе і не інфармуюць раённых арганізацый аб ходзе кантрактацыі. Па Заспаўскім раёне плян кантрактацыі выкананы на... 3 проц.

Раённыя арганізацыі ня ўяўляюць правядзеньня асноўных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да сяўбы і калектывізацыі з кантрактацыяй.

Апартуністычную бяздзейнасьць, слабую растлумачальную работу некаторых мясцовых партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый выкарыстоўвае кулак, які вядзе шалёную агітацыю за срыў пляну кантрактацыі яравых. Па Дубровенскім і Журавіцкім раёнах асабліва ўзмоцнена вядзецца кулацкая агітацыя сярод адсталых жанчын.

Выступленьням апартуністаў і кулапкіх падпявал не даецца ў радзе месц руйнуючага адпору. Камсамольцы, напрыклад, вёсак Хатоўня і Шапчыцы замест растлумачэньня сходам значэньня кантрактацыі, як важнейшага фактару перабудовы сельскай гаспадаркі па сацыялістычны лад, вялі двурушніцкую палітыку, — выступалі за кантрактацыю і абаранялі падкулачнікаў.

Пляны кантрактацыі зусім рэальныя. Аб гэтым сьведчаць добрыя вынікі кантрактацыі па радзе калгасаў, дзе партыйныя арганізацыі і савецка-каапэрацыйны апарат правільна арганізавалі работу і правялі масавую растлумачальную кампанію. Па Журацкім раёне, напрыклад, калгасы амаль што поўнасьцю закантрактавалі яравыя засевы. Некаторыя калгасы як «Араты» высунулі сустрэчныя пляны.

Паводле выразнай дырэктывы ўраду, кантрактацыя павінна быць скончана да 1 красавіка. Цяперашнія тэмпы не гарантуюць выкананьня гэтай дырэктывы.

Трэба бяз усякай літасьці ўдарыць па тых, хто зрывае кантрактацыю. Тыя раённыя арганізацыі, якія дапускаюць зрыў кантрактацыі, праяўляюць самы махровы апартунізм на практыцы.

Перад Ільнасаюзам, Белмапжыўсаюзам, Белсадсаюзам, Наркамснабам, перад усімі раённымі арганізацыямі стаіць баявая задача — неадкладна ліквідаваць прарыў у правядзеньні кантрактацыі, асабліва ў індывідуальным сэктары, разгарнуць масавую кампанію па заключэньні кантрактацыйных дагавораў. Да гэтай справы трэба прыцягнуць увесь раённы актыў. Раёны павінны дабіцца стопроцантага ахопу кантрактацыйнымі дагаварамі ўсёй вызначанай для кантрактацыі плошчы, як у калгасах, так і ў аднаасобным сэктары.

Трэба шырока арганізаваць грамадзкую самаправерку, вышэй узьняць хвалю сацспаборніцтва вакол своячасовага выкананьня і перавыкананьня пляну кантрактацыі яравых.

У рабоце па правядзеньні кантрактацыі трэба дабіцца рашучага пералому, ўзьняць сапраўды ўдарныя тэмпы, даць адпор тым, хто перашкаджае разгортваньню работы, хто ня можа перабудавацца на бальшавіцкія тэмпы, хто спадзяецца на самацёк і праяўляе праваапартуністычныя адносіны да правядзеньня гэтай важнейшай работы.

Бальшавіцкі плян кантрактацыі павінен быць выкананы.

М. К.

Дэкларацыі і справы

ШКЛОЎ. (Наш кар.). КАНТРАКТАЦЫЯ ЯРАВЫХ ПА ШКЛОЎСКІМ РАЁНЕ ПРАХОДЗІЦЬ МАРУДНЫМ ТЭМПАМ. НА 20 САКАВІКА ПЛЯН ПА ЎСІХ КУЛЬТУРАХ ВЫКАНАНЫ НА 19 ПРОЦ. АСАБЛІВА АДСТАЕ АДНААСОБНЫ СЭКТАР, ЯКІ ЗАМЕСТ 3.714 ГЭКТ. ІЛЬНУ ЗАКАНТРАКТАВАЎ ТОЛЬКІ 509 ГЭКТ., БУЛЬБЫ — ЗАМЕСТ 1.860 ГЭКТ. — 155 ГЭКТ.

НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ІЛЬНАВОДЧЫ НАПРАМАК РАЁНУ, КАЛГАСЫ ВЫКАНАЛІ ПЛЯН ПА ІЛЬНЕ ТОЛЬКІ НА 67 ПРОЦ., А ПА АСТАТНІХ КУЛЬТУРАХ ЯШЧЭ МЕНШ.

У ВЫНІКУ РАДУ НЕДАРЭЧНАСЬЦЯЎ У ТЭХНІЧНЫМ ПРАВЯДЗЕНЬНІ КАНТРАКТАЦЫІ ПААСОБНЫЯ ВЕСКІ ЯШЧЭ ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЯ ПРЫНЯЛІ ПЛЯНАЎ. СЕЛЬСАВЕТЫ НІЧОГА НЯ РОБЯЦЬ, КАБ ДАБІЦЦА ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНАЎ.

З БОКУ РАЙКААПСАЮЗУ І РАЙЗЕМЧАСТКІ НЯМА ПАСТАЯННАГА КІРУЎНІЦТВА КАНТРАКТАЦЫЯЙ. З СЕЛЬСАВЕТЫ ПАОГУЛ ВЫПАЛІ З ПЛЯНАЎ КАНТРАКТАЦЫІ.

ШКЛОЎСКІ РАЁН АДЗІН З ПЕРШЫХ У БССР ПРЫСТУПІЎ ДА ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ ГІСТАРЫЧНАЙ АДОЗВЫ АБ КАНТРАКТАЦЫІ, АЛЕ РАЙКОМ ПАРТЫІ НЕ ЗАМАЦАВАЎ ГЭТАГА І НЕ МАБІЛІЗАВАЎ УСІХ СІЛ НА РЭАЛІЗАЦЫЮ АДОЗВЫ ПАРТЫІ І УРАДУ.

ЯН.

КАЛГАС „УСХОДЫ ЛЕНІНА" ЗАКАНТРАКТАВАЎ ПАСЕВЫ

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). Агульны сход калгасаў «Усходы Леніна» пасьля прапрацоўкі адозвы партыі і ўраду аб кантрактацыі пастанавіў закантрактаваць раньняй капусты 8 тон, позьняй — 9 тон, цыбулі — 1 тону, памідораў — 4 тоны, буракоў сталовых — 10 тон, моркву — 7 тон, бульбы раньняй — 5 тон. Калгасьнікі адгалосна ўхвалілі плян кантрактацыі сьвіней, паводле паказаньня райкалгасаюзу.

Спыніць мабілізацыю рабочых ад варштату на патрэбы бягучых кампаній мясцовымі партыйнымі, савецкімі іншымі арганізацыямі

1. Забараніць мабілізацыю партыйнымі, савецкімі, прафсаюзнымі, камсамольскімі і усялякімі іншымі арганізацыямі рабочых ад вытворчасьці і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу ў прамысловасьці і на транспарце для ўсялякага роду кампаній.

2. Мабілізаваных са студзеня гэтага году на бягучыя кампаніі бяз ведама ЦК УсеКП(б) і СНК Саюзу ССР рабочых ад вытворчасьці і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал у прамысловасьці і на транспарце неадкладна вярнуць на прадпрыемствы.

3. Забараніць адцягненьне рабочых ад вытворчасьці і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу з боку партыйных, савецкіх, прафсаюзных, камсамольскіх, гаспадарчых арганізацый і органаў друку ў рознага роду абсьледаваньняў і брыгады.

4. Зьвесьці да мінімуму выклік дырэктараў на ўсялякага роду пасяджэньні выходзячы з таго, што адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал прадпрыемства павінен быць цалкам занят сваёй непасрэднай работай на прадпрыемстве.

5. Пацьвердзіць пастанову ЦК ад 20 кастрычніка 1930 году аб забароне на два гады выпучаць рабочых і тэхнічны пэрсанал з вытворчасьці на савецкую работу, прычым там, дзе гэта дырэктыва парушана і кваліфікаванныя рабочыя, а таксама тэхпэрсанал вытворчасьці былі вылучаны і накіраваны на савецкую работу вярнуць іх на вытворчасьць.

6. Забараніць камандыроўкі рабочых у рабочы час па ўсялякага роду шэфскіх і іншых справах.

7. Скасаваць усе пастановы мясцовых партыйных, савецкіх і прафсаюзных органаў, устанавіўшых у парушэньне законаў аб працы скарочаны рабочы дзень для занятых на ўсялякага роду вучобе і на грамадзкай рабоце з тым, каб гэтыя заняткі праводзіліся толькі па-за рабочым часам.

8. Устанавіць, што выкананьне ўсякага роду грамадзкіх абавязкаў рабочымі ад вытворчасьці, удзел у сэкцыях саветаў і камісіях, у партыйных, прафсаюзных, каапэрацыйных і іншых органах павінна праводзіцца выключна па-за рабочым часам. У адпаведнасьці з гэтым прапанаваць партарганам, саветам, прафсаюзам, каапэрацыйным і іншым грамадзкім арганізацыям прыстасаваць сваю масавую работу да нерабочага часу.

9. З прычыны таго, што наглядаюцца выпадкі, неарганізаваныя перакідкі рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу з адных прадпрыемстваў на іншыя, і новыя будаўніцтвы, прапанаваць ВСНГ сумесна з Наркампрацай прыняць меры да ўпарадкаваньня гэтых перакідак.

10. Усклясьці на дырэктараў заводаў непасрэдную адказнасьць за правядзеньне мер у адносінах рабочай сілы, тэхпэрсаналу на прадпрыемствах у адпаведнасьці з гэтай пастановай.

11. Прапанаваць ЦКК-НК РСІ і яе мясцовым органам устанавіць стражайшую праверку выкананьня гэтай пастановы неадкладным прыцягненьнем да адказнасьці яе парушыцеляў.

СТАРШЫНЯ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗУ ССР
В. МОЛАТАЎ (СКАРБІН).

САКРАТАР ЦК Усе КП(б) І. СТАЛІН.

25 сакавіка 1931 году.

Аб парадку правядзеньня ў жыцьцё п. п. 14 і 15 прыкладнага статуту с.-г. арцелі

Растлумачэньне Наркамзему і Калгасцэнтру СССР

Зацьверджана ЦВК і СНК СССР 25 сакавіка 1931 году

Асноўныя сельска-гаспадарчыя работы с.-г. арцелі ажыцьцяўляюцца на аснове зьдзельшчыны.

Праўленьнем калгасаў распрацоўваюцца і якульным сходам калгаснікаў спаць вярджаюцца па ўсіх с.-г. работах нормы выпрацоўкі і расцэнкі кожнай работы ў праца-днёх у адпаведнасьці са ступеньню труднасьці работы, ступеньню вопытнасьці і кваліфікацыі, якая патрабуецца для ажыцьцяўленьня работы, улікам якасьці работы і важнасьці яе для калгасаў.

Разьмеркаваньне прыбыткаў арцелі сярод яе членаў праводзіцца не па душах, а ў дакладнай адпаведнасьці з колькасьцю выпрацаваных калгаснікам праца-дзён (за выключэньнем 5 проц. прыбытку, якія разьмяркоўваюцца паміж калгаснікамі адпаведна ўнесенай імі ў абагулены фонд калгасу маемасьці).

Заўвага: У мэтах дапамогі шматсямейным калгаснікам, праўленьнем калгасу і агульным сходам калгаснікаў стварацца спэцыяльны фонд у дапамогу непрацаздольным, ці шматсямейным або пры разьмеркаваньні работы забясьпечваецца такая колькасьць работы, якая дае ім магчымасьць забясьпечыць непрацаздольных членаў сям'і неабходнымі харчамі.

Аб масавай праверцы сапраўднага ажыцьцяўленьня ў калгасах пастановы VI зьезду саветаў аб калгасным будаўніцтве

Пастанова Наркамзему СССР і Калгасцэнтру СССР ад 24 сакавіка 1931 г.

Пасьляховае правядзеньне пасеўнай і ўборачнай кампаній гэтага году ў вялізарнай меры залежыць ад таго, як хутка на справе будзе ажыцьцёўлен пераход калгасаў да разьмеркаваньня прыбыткаў не па душах, а па працы.

НКЗ СССР і Калгасцэнтр СССР прапануюць у адпаведнасьці з гэтым устанавіць наступныя крайнія тэрміны для прапрацоўкі ва ўсіх калгасах пастановы 6-га зьезду саветаў аб калгасным будаўніцтве, а таксама фактычнага пераводу ў калгасах асноўных с.-г. работ на зьдзельшчыну, ацэненай праца-днямі:

1) Для Паўночнага Каўказу, Украіны, Ніжняй і Сярэдняй Волгі і ЦЧО — не пазьней 10 красавіка гэтага году.

2) Для рэшты раёнаў—не пазьней 15 красавіка г. г.

У мэтах забесьпячэньня правядзеньня гэтых мерапрыемстваў ва ўстаноўленыя тэрміны НКЗ і Калгасцэнтр прапануюць:

1. Неадкладна мабілізаваць і накіраваць у калгасы ўсіх тых земельных і калгасных работнікаў, якія дабра разьбіраюцца ў пытаньнях арганізацыі працы і могуць дапамагчы калгасам у справе пераходу на зьдзельшчыну і ацэнку працы ў праца-днёх.

2. ШТОДЗЕННА САМЫМ ПАДРАБЯЗНЫМ ЧЫНАМ АСВЯТЛЯЦЬ У ДРУКУ ВОПЫТ ЛЕПШЫХ КАЛГАСАЎ, УЖЫЎШЫХ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ, ЗЬМЯШЧАЮЧЫ ФАКТЫЧНЫ МАТАР'ЯЛ АБ НОРМАХ ВЫПРАЦОЎКІ, ЯКІЯ УЖЫВАЮЦЦА ІМІ НА ПРАКТЫЦЫ, І АБ АРГАНІЗАЦЫІ РАБОТЫ.

3. Магчымна шырэй ужываць пасылку калгаснікаў, якія вывучылі правільныя пачаткі арганізацыі працы і разьмеркаваньне прыбыткаў, на некалькі дзён у калгасы, якія яшчэ не ажыцьцявілі гэтага пераходу, для іх інструктаваньня.

4. Не пазьней 10 красавіка ў раёнах першай чаргі сяўбы і не пазьней 15 красавіка — у рэшце раёнаў краёвым земельным і калгасным органам зрабіць справаздачы перад НКЗ і Калгасцэнтрам аб рэзультатах правядзеньня гэтай работы.

Народны камісар Зямляробства Саюзу ССР тав. Я. ЯКАЎЛЕЎ.

Старшыня Праўленьня Калгасцэнтру Саюзу ССР тав. ЮРКІН.

Польскі фашызм на ўсіх парах прэ да авантур

Чым вастрэй гаспадарчы крызіс у фашысцкай Польшчы і шырэй фронт клясавых баёў, чым больш грозным зьяўляецца ўнутранае становішча краіны, тым больш наглядаецца ваяўнічых выступленьняў пілсудчыкаў, тым больш адкрытымі становяцца іх заклікі да антысавецкага паходу. У вайне з Савецкім Саюзам польскі фашызм бачыць выхад з таго гаспадарчага тупіка, у якім апынулася фашысцкая Польшча.

Актывізацыя антысавецкай кампаніі ў Польшчы асабліва ўзмацняецца з набліжэньнем вясны, або, як піша фашысцкая прэса, «калі крыху падсохне». Сьледам за ўзмацненьнем антысавецкай кампаніі пачынае наглядацца і росквіт мілітарысцкіх настрояў у фашысцкай Польшчы. Праўда, у бягучым годзе яшчэ «не падсохла», яшчэ зіма стаіць ва ўсёй сваёй сіле, а мы ўжо мелі манэўры цэлай дывізіі ў Навагрудзкім ваяводзтве пры шырокім удзеле ўсіх фашысцкіх арганізацый як мясцовых, так і прыежджых аж з Познані. Адбыліся манэўры цэлай дывізіі ў Вільні, на якіх прысутнічалі вайсковыя аташэ 13 дзяржаў, манэўры ў Слоніме і г. д. Нядаўна нямецкая прэса паведамляла аб раптоўнай пробнай мабілізацыі ў Верхняй Сілезіі. Пры гэтым мабілізаваныя былі накіраваны на ўсходнюю граніцу. І гэта робіцца ў той момант, калі міністар замежных спраў Залескі салаўём заліваецца аб «міралюбстве» Польшчы.

Вялізарны ваенна-палітычны апарат польскага імпэрыялізму знаходзіцца ў руху. Залескі салаўіными высьвістамі аб «міралюбівых настроях» Польшчы апрацоўвае грамадзкую думку заграніцаю, генштаб ліхаманкава ўзбройваецца і падрыхтоўвае вайну, а дэфэнзыва душыць рэвалюцыйны рух як у самой Польшчы, так і нацыянальна-вызваленчы рух у Зах. Беларусі і Зах. Украіне, падрыхтоўваючы тылы для будучых ваенных апэрацый. Адным словам усё за «работай».

Але што ў французкага генштабу ў галаве, дык у польскіх фашыстаў на языку. «Газэта Варшаўская» ў нумары 85 ад 14-га сакавіка, падаючы высмактаныя з пальца весткі аб нашай Чырвонай арміі, у канцы далае, што «гэтай вясною абдуцца на Савецкай Украіне першараднай важнасьці выпадкі».

Што гэта за выпадкі, для працоўнага Савецкага Саюзу не сакрэт. Варта толькі прыпомніць паказаньні шкодніку к «прампартыі» Рамэйна, Ларычава і іншых. Варта таксама прыпомніць і перагаворы белагвардзейскага генэрала Мілера ў часе яго «інспэкцыйнай» паездкі па Эўропе а румынскім уралам аб пасяленьні ў Румыніі (Бэсараби) цэлага белагвардзейскага корпусу,—як намёк «Газэты Варшаўскай» стане зусім ясным.

На агульным фоне веснавога ажыўленьня ў лягеры польскага фашызму вельга абыйсьці моўчкі перагаворы паміж польскім фашызмам і украінскім нацыянал-фашызмам. Як паведамляе буржуазны яўрэйскі «Наш шпалёнд», польскі фашызм патрабаваў ад ундаўпаў перш чым пачаць перагаворы, агалясіць дэкларацыю аб поўнай лёяльнасьці ў адносінах да польскай дзяржавы, а таксама забраць з Лігі Нацый скаргу ў справе украінскага пагрому ўвосень мінулага году. Гэтыя перагаворы выразна характарызуюць здрадніцкую ролю УНДО, якое ў сваіх выступленьнях у сойме ня раз выказвала гатоўнасьць «забыць справу пацыфікацыі» за нібы ўвядзеньне аўтаноміі ў Зах. Украіне. У часе перагавораў з польскім фашызмам цана «лёяльнасьці» была зьніжана да патрабаваньня аказаньня дапамогі буржуазным украінскім каапэратывам.

Шчытом-жа правакацыі, нахабнасьці, нагласьці польскага фашызму ў адносінах да СССР зьяўляецца выступленьне гэтымі днямі фашысцкага брукоўна «Кур'ера подзеннага». У 10-ую гадавіну падпісаньня Рыскага дагавору гэта фашысцкая прастытутка мае нагласьць выступаць з абвінавачэньнем СССР у «невыкананьні Савецкім Саюзам узятых на сябе Рыскім трактатам абавязацельстваў».

Прадстаўнікі фашысцкага ўраду, таго ўраду, які наладзіў пагромы, які карнымі экспэдыцыямі некалькі раз залівае Зах. Беларусь і Зах. Украіну, які дзесяткі тысяч працоўных беларускіх і украінскіх сялян катуе ў турмах толькі за іх жаданьне гаварыць і вучыцца на сваёй роднай мове, нарэшце, які аднаразіўся сярэднявяковую інквізыцыю, ставраўшы Луцк, Бепестак, Вронкі, яні Зах. Беларусь і Зах. Украіну абярнуў у свае калёніі,—відаць, забываюцца аб тым, што гавораць.

Аднак фашысцкая прастытутка не абмяжоўваецца толькі гэтым антысавецкім выпадам,—яна ідзе далей і выбрэхвае тое, што ў пана Галувко было ў галаве, калі ён выступаў у сойме ў якасьці «прадстаўніка» беларускага насельніцтва Зах. Беларусі. Фашысцкая газэта піша: «Сучасная польска-савецкая граніца зьяўляецца недарэчнасьцю, бо яна панінула на другім баку межы пад уладай савецкай чыста польскія землі, што Менск зьяўляецца чыста-польскім горадам».

Тут ужо няма куды ісьці далей. Нішто сабе анэтыт польскага фашызму. Фашысцкая шмата з галавой выдае «нарадавасьцёву» палітыку фашысцкага ўраду, аб якой так расьпінаўся пан Галувко, а таксама выдае і сэкрэтнікаў фашызму—беларускіх нац.-фашыстаў і нацдэмаў. Гэта заява «Кур'ера подзеннага» ставіць кропку на «і». «Праз 25 год ад беларусаў і беларускага руху не застанецца і сьледу»—было сказана ў часе рыскіх перагавораў прадстаўніком буржуазнай Польшчы Домскім. Як ні стараўся пан Галувко, пусьцяўшы ў ход усё сваё красамоўства, утаіць сапраўдныя мэты польскага фашызму ў адносінах да беларусаў і украінцаў, гэта яму не ўдалося.

Нельга прайсьці моўчкі таксама і выступленьне генэрала Рыдз-Сьміглага на зьезьдзе ПОВ—махрова-фашысцкіх, шпіёнска-дывэрсыйных груп пілсудчыкаў, які адбыўся 16-17 сакавіка ў Варшаве. Зварачаючыся да пэонякаў Рыдз-Сьміглы, між іншым, заявіў:

«Польшча ў сваім гістарычным мінулым перажывала ня раз вялікія падзеі, мела вялікія магчымасьці, якія амаль ніколі ня былі скарыстаны. Польшчу чакаюць у будучым вялікія і вельмі адказныя задачы. Мы можам зноў мець выключныя на сваёй грандыёзнасьці магчымасьці...»

Яшчэ больш цынічным, чым выступленьне «Кур'ера подзеннага», зьяўляецца выступленьне органу вайсковага міністэрства «Польскі збройны». У гадавіну 10-годзьдзя падпісаньня Рыскага дагавору рэдактар гэтай газэты, палкоўнік Эвэрт пісаў: «Не вінавата, зразумела, польскае войска, а таксама правадыр (Пілсудскі), што мы дабіліся толькі граніц, якія супадаюць, прыкладна, з лініяй другога падзелу Польшчы. На жаль, была пяўторана гістарычная памылка разрэзаных Беларусі і Украіны. Чыста-польскі горад Менск застаўся пад уладаю Савецкага барбарства».

Фашысцкія башыбузукі трацяць роўнавагу. З шалёнаю злобаю яны ўспрымаюць страчаныя польскімі памешчыкамі і заводчыкамі землі і заводы, якія зараз знаходзяцца ў Савецкай Беларусі і Савецкай Украіне і зьяўляюцца ўласнасьцю працоўных

Узмацніць парткіраўніцтва фракцыямі прафарганізацый

Узьняць ролю заўкомаў і цэхкамітэтаў у вырашэньні канкрэтных пытаньняў работы на прадпрыемствах

Работу прафарганізацый— на вышыню палітычных задач

Цяпер выкананьне прамфінпляну на ўсіх участках на кожным прадпрыемстве абумоўліваюцца ненакіраным ажыцьцяўленьнем генеральнай лініі партыі, рашучым змаганьнем за выкарчоўваньне апартуністычнай практыкі, якая мае месца ў рабоце масавых партыйных, прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый.

Усё ўзрастаючая актыўнасьць і творчая ініцыятыва рабочых мас у змаганьні за высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, сапраўдныя ўзоры камуністычнай працы зьяўляюцца заручкай поўнай магчымасьці ня толькі выкананьня, але і перавыкананьня вытворчай праграмы трэцяга рачковага году пяцігодкі.

Адставаньне і прарывы, якія дапушчаны ў выкананьні прамфінпляну за першы квартал на некаторых прадпрыемствах БССР, тлумачацца тым, што партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі гэтых прадпрыемстваў не забясьпечылі сваёй работай сапраўды ударных тэмпаў працы ў кожным масавым вытворчым зьвяне, не правялі належнай гібкасьці ў справе своечасовага накіраваньня і зьмяшчэньня нераншкод, што сустракаюцца ў вытворчай рабоце. Партыйныя арганізацыі на вазе прадпрыемстваў усім невыстарчальна кіруюць работай прафсаюзных арганізацый. Да гэтага часу яшчэ ня ўсюды праведзена ў жыцьцё дырэктыва XVI партызьезду аб тым, што «цэнтр цяжару работы прафсаюзаў павінен быць перанесен у іх мізаўрэ першачарговыя зьвяны —ударную брыгаду, групу, зьмену».

На фабрыках «Чырвоная Бярэзіна» і «Пралетарская перамога» работа прафарганізацыі не перабудавана на вах арганізацыйна. Разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва фабком кіруе ўсім невыстарчальна. Бюро партколектыву гэтых прадпрыемстваў не прымае выкананьня сваіх дырэктыў аб паляпшэньні работы прафарганізацыі, не рэагуе на бюджэтнасьць фабкому. Аналогічна недахопы ў работе прафсаюзных арганізацый і кіраўніцтва з боку партколектыву бачым на піцебскім заводзе «Чырвоны мэталіст» і інш. прадпрыемствах.

Такое становішча недапушчальна. Нельга разумець перабудову прафработы на прадпрыемстве «вуха, толькі з арганізацыйнага боку, як гэта мае месца на масавых прадпрыемствах. Неабходна, каб вынест работы ўсіх звёнаў прафсаюзных арганізацый быў падпарадкаван вэнэўнай задачы на прадпрыемстве—выкананьню прамфінпляну на колькасных і якасных паказьніках, залічам замацаваньня і далейшага паляпшэньня сацыялістычных метадаў працы на вытворчасьці.

Сыстэматычнае паляпшэньне работы прафсаюзаў на прадпрыемстве немыслімае без шырокага разгортваньня пралетарскай самакрытыкі, як важнейшай зброі ў змаганьні на выкарчоўваньні апартуністычнай практыкі, у змаганьні з хвасьлізмам і іншымі нездаровымі зьявішчамі.

Паляпшэньне работы прафсаюзных арганізацый залежыць ад кіраўніцтва прафарганамі з боку партыйных калектываў. «Партыйныя арганізацыі павінны палепшыць і ўзмацніць канкрэтнае кіраўніцтва работай прафсаюзных арганізацый, упумбаючыся ў зьмест работы прафсаюзаў, дапамагаючы ім выпраўляць іх недахопы і памылкі ў працэсе работы» (з пастановы XVI партызьезду).

Палепшыць кіраўніцтва

З боку партыйных калектываў пасобных прадпрыемстваў гор. Барысава назіраецца недаацэнка задачы паляпшэньня работы прафсаюзных арганізацый. Перабудова работы партыйнай арганізацыі на фабрыках «ЧЫРВОНАЯ БЯРЭЗІНА» і «ПРАЛЕТАРСКАЯ ПЕРАМОГА» праведзена ў студзені месяцы. Сэнс гэтай перабудовы заключаецца ў тым, што ўся работа сканцэнтроўваецца пераважна ў нізавых вытворчых зьвяньнях. Але прафарганізацыі на гэтых прадпрыемствах не перабудавалася нават арганізацыйна. Бюро парткалектыву і цэх'ячэйкі зусім слаба кіруюць работай прафарганаў. З часу апошніх перавыбараў цэх'ячэйкі не заслухоўвалі ні разу дакладаў старшынь цэхкамітэтаў аб прафработе.

Слабое кіраўніцтва работай прафсаюзнай арганізацыі з боку парткалектыву, адсутнасьць праверкі выкананьня дырэктыў, рэзка адбіліся на ўдавным руху ў бок яго аслабленьня. Пасобныя ўдарныя брыгады зьнізілі свае тэмпы працы ў параўнаньні з мінулым. Фабком да такога зьявішча адносіцца апартуністычна, стаіць у баку ад актыўнасьці рабочых мас.

Такія-ж недаходы партыкіраўніцтва прафработай маюць месца на заводзе «Камінтэрн» і гуце імя Домбаля.

Прыклады добраго кіраўніцтва прафсаюзнай работай паказала парт'ячэйка каподачнай фабрыкі. На гэтай фабрыцы, дзякуючы добра пастаўленай масавай рабоце і сыстэматычнаму кіраўніцтву кодам сацспаборніцтва і ўдарніцтва, ёсьць добрыя вынікі ў выкананьні прамфінпляну і па колькасьці і па якасьці.

Трэба рашуча паставіць пытаньне перад парткалектывамі і ячэйкамі аб палепшэньні іх кіраўніцтва работай прафарганаў.

БАРЫСАЎСКІ.

Ужыць рашучыя захады

Парт'ячэйка пегазаводу «Капектыўная праца» (Азарычы) не забясьпечыла сваёй работай пасьпяховае выкананьне прамфінпляну. Пегазавод спаўняе вытворчую праграму за асобны квартал з вялікім прарывам, недавыкананьнем не на 17 проц.

У сэтым годзе таксама праграма ўвесь час ня выконваецца на колькасных і асабліва на якасных паказьніках.

Ня сьледзячы на гэтыя сыстэматычныя прарывы, ячэйка літаральна нічога ня ўжывае для ліквідацыі іх і мабілізацыі актыўнасьці рабочых мас на перавыкананьне прамфінпляну. Наадварот, апартуністычнае кіраўніцтва ячэйкі лічыць, што сьпяшацца няма куды, усё роўна і так прадукцыя, якую вырабляе завод, возьма адпраўляць таму, што не надасьцца на станцыі патробнай колькасьці вагонаў. Такі погляд пранасіцьме ніхто бюро ячэйкі Резьнікаў, а ячэйка, ведаючы пра гэты факт, не рэагуе на яго.

Ячэйка не толькі ня стала на чале актыўнасьці і творчай ініцыятывы рабочых, а сваімі апартуністычнымі ўстаноўкамі давала да распаду ўдарныя брыгады, якія стварыліся стахійна і не знаходзілі ніякага падтрыманьня з боку кіраўніцтва заводу. Перадавыя рабочыя, якія паказвалі ўзоры прыкладу працы на прадпрыемствах, нічым не заахвочваліся. Нават у часы, калі стварыліся перабоі ў выплаце заработнай платы, дык дырэктар заводу Коратневіч аддаў загад ударникам выплачваць зарплату ў апошнюю чаргу. Прагульшчыкі, падтрымліваемыя ў адказнасьці ня прыцягваюцца да адказнасьці на адміністрацыйнай лініі. Парт'ячэйка і фабком ніякай выхаваўчай работы не праводзяць для ўзмацненьня працоўнай дысцыпліны і павышэньня прадукцыйнасьці працы з мэтай ліквідацыі прарываў.

У гэтай ячэйцы панує апартуністычная практыка і адкрыта пранагандуецца ідэалёгія правага ўхілу. Апартуністы выказваюць сумненьні ў правільнасьці генеральнай лініі партыі. Калі на пасяджэньні бюро абмяркоўваўся кандыдатура аднаго рабочага для вылучэньня яго камэсьнікам дырэктара заводу і члена бюро ячэйкі абмеркоўваліся думкамі, як карыстацца тэты так. «Чырвоны сярод рабочых мас, ніяк шкровы апартуніст Мацюноў заявіў: «той, хто правадзіць вырвана генеральную лінію партыі, той ня можа карыстацца аўтарытэтам сярод рабочых». І вось гэты рупар кулацкай ідэалёгіі, які пакінуў на партыю і рабочых, ня сустрэў ніякага адпору з боку бюро ячэйкі.

Азарыцкі райком партыі нанёс жорсткія ўдары па апартуністах і ўжыць рашучыя захады да ацаразьдзяньня ячэйкі і ліквідацыі тых прарываў, якія ёсьць на пегазаводзе.

БРЫГАДЗІР.

Павысіць ролю ячэек у рэдакцыях

Да перавыбараў бюро цэхячэек цэнтральных газэт

Кампанія перавыбараў бюро цэхячэек КП(б)Н —кампанія бальшэвіцкаю аналізу работы на ажыцьцяўленьні генеральнай лініі партыі. Гэта кампанія павінна ячэйкі больш узьняць баяздольнасьць ячэек для далейшай бальшэвіцкай барацьбы супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць усялякіх уплываў ад генеральнай лініі партыі.

Парткалектыў рэдакцый цэнтральных газэт на сваім арганізацыйным абмеркаваньні пераўладна малады. Толькі 11 месяцаў таму назад партыйцы—працаўнікі цэнтральных газэт быў сабраны ў ячэйкі. Пры рэдакцыях газэт створаны 6 цэхавых ячэек. Толькі 11 месяцаў таму назад быў зьяўлен разрыў паміж партыйнай нагрузкай і вытворчымі задачамі. І калі ў тый час, ячэйкі было сумненьне ў некаторых членаў партыі аб мэтазгоднасьці стварэньня парткалектыву, калі тады дзе-ні-дзе спатнкалі «у штыкі» пастанову Фрунзэнскага РК аб гэтым, дык зараз відавочна для ўсіх мэтазгоднасьць яго існаваньня.

Парткалектыў рэдакцый падыходзіць да сваіх перавыбараў са значнымі дасягненьнямі. Пасьлядні ячэйкі і парткалектыў цалкам былі, ёсьць і будуць сапраўднымі дапамежнікамі цэнтральнага камітэту і гаркому партыі ў справе узбраеньня пашыра ідэку для барацьбы за пяцігодку. Цяпер ячэйкі і парткалектыў здолелі па-бальшэвіцку мабілізаваць усю масу журналістаў на выкананьне задач партыі. Усё разам узятае значна далемагло ўзьняць ролю цэнтральных газэт у барацьбе за генеральную лінію партыі.

Але разам з відавочнымі дасягненьнямі нельга закрываць вачэй на тыя прарывы і памылкі, якія мелі месца ў цэнтральных газэтах, значная віна за якія зрываецца на парткамітэце рэдакцый. Ячэйкі і парткалектыў не прайшлі міма дагучэньня памылак, дапушчаных на іх, а ўсёй бальшэвіцкай рашучасьцю, мабілізаваў усю масу журналістаў на выкараненьне гэтых памылак.

Перад парткалектывам стаіць задача пакончыць з апартуністычным абмежаваньнем работы ідэку і рабсенкораў толькі закрываўай работай, і дасягнуць сапраўднай удзельнасьці і прыкладнасьці ў рабоце кожнага працаўніка ідэку і ўнутры рэдакцый. Прыведзены нядаўна, у адказ на пастанову ЦК аб сваячасовым выходзе газэт, месячнік штурму па рэдакцыях цэнтральных газэт быў своечасовым крокам адпаведнасьці дзе'ячэек дамагацца ўдарнасьці. Досыць ясна было сказана і паказана, што мала крытыкавацца іншых за дрэннае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, за слабую працэсіяльнасьць, зроба ўнутры рэдакцый давець прыклад.

Ячэйкі павінны былі дамагчыся прыкладнай пастановы працоўнай дысцыпліны ў рэдакцыях, разгортваньня там спаборніцтва і ўдарніцтва. І сёньня трэба сказаць, што, ня гледзячы на пасьпяховае правядзеньне месячніка, усё-ж пастанова ЦК пакуль ячэйкі ня выканана. Ня ўсе дасягнутыя на час штурму постахі замацаваны. Ячэйкі часам існуе пастрой «самазадальства» да ацуратнасьці ўнутры рэдакцый. Ёсьць выпадкі, што колькасныя паказчыкі дасягнуты за кошт якасьці (тэхнічныя памылкі, перарастаючыя ў палітычныя)

Мы ня можам на сёньня пахваліцца станоўчымі вынікамі змаганьня за кадры. Ячэйкі мала зробілі ў справе ліквідаваньня вячэрніка газэтнага аддзяленьня, замацаваньня выдуючыхся, ахопу іх пугобай. Недаваньняючы ячэйкі разгорнута работа сярод рабселькораў, між тым выкананьне пастановы Усесаюзнай нарады патрабуе ад ячэек рэдакцый значнай работы.

Недаацэнка масавай работы—зьяўляецца адной з праяў правага ўхілу. На сёньняшні дзень гэтай правае ніяны ячэйкі не далі ніяк належнага адпору. У калектыве вельмі нізкі ўзровень у справе кіраўніцтва прафячэйкамі і камсамолам. Нашы прафячэйкі не перабудавалі поўнасьцю сваёй работы. І калі бліжэй цэнтральнага друку, у справе разгортваньня бальшэвіцкай самакрытыкі досыць моцны, дык унутры рэдакцый ён нізкі ад чым сьведчыць становішча хаця-б насьценных газэт у рэдакцыях.

Наш цэнтральны друк вядзе барацьбу супроць недаацэнкі ваеннай небясьпекі, за валізацыю. Самі-ж журналісты пакуль моўчкі абыходзяць гэту справу. Мы пакуль ня ўзяліся за ажыцьцяўленьне лёзунгу «бальшэвікі павінны авладаць тэхнікай». Між тым сёньня лёзунг гэты ставіць канкрэтную задачу перад журналістамі—авладаць тэхнікай газэты, кожнаму загадчыку і работніку сэктару трэба ведаць тэхнічны мінімум сваёй галіны работы. Пачаты гэтымі днямі дакамольскім калектывам шлях за тэхніку павінен быць пырэнь кадрамі дзе'ячэйкамі.

Важнейшай задачай у рабоце парт'ячэйкі зьяўляецца павышэньне партыйнасьці, адказнасьці і актыўнасьці, ці перш выкананьні, перабудова партыйнай работы, і тут перад намі вялікачы край.

У складзе парткалектыву ёсьць адна вытворчая ячэйка. Нашым буйным недахопам зьяўляецца тое, што сёньні ўсяго парткалектыву мы не дамагаліся там прыкладнай пастановкі работы

Падсумкі вынікі, разгарнуць наступленьне на недахопы, змагацца за далейшае павышэньне ролі цэнтральнага друку, у барацьбе за генеральную лінію партыі і роллі ячэек у рэдакцыях—баявая задача, пад знакам якой пасьпяхова правядзем нораньбары.

Г. Скакальскі.

Прамысловасьці БССР— ТАРФЯНЫ АПАЛ

Праграма Белторфу павінна быць максымальна павялічана

Торфазаводы, высоўвайце сустрэчныя пляны здабычы торфу

Поўнасьцю забясьпечым фабрыкі і заводы танным мясцовым апалам

Фарсаваць здабычу торфу

Пагадова ЭКАНА БССР аб пераводзе ўсіх прадпрыемстваў да канца пяцігодкі выключна на тарфяны апал патрабуе ўзмацненьня тэмпаў разьвіцьця тарфяной прамысловасьці. Між тым, пляны торфаздабычы НА 1931 ГОД і да канца пяцігодкі не адпавядаюць вызначанаму пляну пераводу прадпрыемстваў на ўжываньне тарфянога апалу. Пры першай праектоўцы было вызначана здабыць у 1931 годзе 900 тыс. тон торфу. Пасьля абмеркаваньня гэтай праграмы рядам арганізацый, яна была ўрэзана да 600 тон торфу. Нарэшце Белторф склаў канчатковую праграму, якая прадугледжвае здабыць у 1931 годзе 650 ТЫС. ТОН ТОРФУ, што, аднак, забясьпечыць патрэбнасьць у тарфяным апале, згодна заявак прадпрыемстваў, ТОЛЬКІ НА 50 ПРОЦ. Такім чынам, нават тыя прадпрыемствы, якія ўжо зараз працуюць на тарфяным апале, ня будуць поўнасьцю забясьпечаны, ня кажучы ўжо аб пераводзе іншых прадпрыемстваў на тарфяны апал.

Гэтую праграму можна было-б паваліць пры ўзмацненьні ТЭХНІЧНАЙ БАЗЫ тарфяной прамысловасьці. Аднак, здабыча торфу машынным спосабам будзе складаць толькі 30-40 проц. Рэшта будзе здабыта напалову саматужным метадам, бо да гэтага часу адгрузка асноўнага абсталяваньня—пёкамабілёў, трактараў і фрэзэраў—ЯШЧЭ НЕ ПАЧАТА. Няма нават цьвёрдых тэрмінаў адгрузкі вызначанага абсталяваньня. Між тым, каб мець магчымасьць своячасова пачаць торфараспрацоўкі, трэба НЕ ПАЗЬНЕЙ ПАЧАТКУ КРАСАВІКА вывесьці абсталяваньне на балоты. Весьнавая паводка гэтай магчымасьці ня дасьць.

Ня вырашана пытаньне аб арганізацыі майстэрань пры торфазаводах для рэмонту машын. Ня вырашана пытаньне аб забясьпячэньні торфазаводаў мінімальнай колькасьцю рамонтных варштатаў.

Таксама невядома, што будзе з выкананьнем транспартнай праграмы. Адсутнасьць транспарту ў гэтым годзе мела адмоўны ўплыў на выкананьне плянаў вывазкі. На 1931 год запраектавана ўкладзьці 30 клм. вузкакалейкі. Мадаўецца атрымаць 600 вагонэтак і 11 вузкакалейных паравозаў. Калі гэта ўсё будзе атрымана—невядома. Саюзторф на дзесятку напамінаў Белторфу ня пічыць патрэбным адказаць.

Каб рэканструляваць адсталую тарфяную прамысловасьць, падвесьці пад ня тэхнічную базу — патрэбны тэхнічна-пісьменныя людзі. Патрэбнасьць у тэхнічным пэрсанале на 1931 год складае 150 інжынэраў і 250 тэхнікаў. Узьнікае пытаньне аб прыстасаваньні раду навучальных устаноў да патрэб тарфяной прамысловасьці. Трэба стварыць пры ВТНУ тарфяны інстытут і пры ім спэцыяльны тэхнікум. Гэта толькі ў некаторай ступені палегчыць вострую патрэбу ў тэхнічных кадрах.

Зусім калюча стаіць справа з падрыхтоўкай рабочай сілы. Для выкананьня праграмы 1931 году патрабуецца ня менш 12 тыс. тарфянікаў, з якіх 50 проц. павінны быць кваліфікаванымі. Саюзторф ня даў Белторфу выстарчальнай колькасьці рабкаў для вярбоўкі рабсілы. Наркампрацы БССР і мясцовыя органы працы вельмі павяжліва адносяцца да ўкамплектаваньня торфазаводаў рабочай сілай. У выніку: на 10 сакавіка замест 12 тыс. тарфянікаў завербавана толькі 4 тыс. чалавек.

Трэба сказаць, што да гэтага часу тарфяная прамысловасьць не карыстоўцца асаблівай увагай грамадзянскасьці. Наш друк да гэтага часу не мабілізаваў грамадзкую думку за пераўтварэньне БССР з не вялізарнымі тарфянымі багацьцямі —у тарфяны Данбас.

У гэтым пытаньні трэба дабіцца рашучага пералому. Закінутыя напаўпу соматужныя дробныя заводзікі павінны стаць магутнымі механізаванымі торфазаводамі. Неадкладна павінна быць вырашана пытаньне аб забясьпячэньні тарфяной прамысловасьці БССР абсталяваньнем.

Усесаюзная нарада па торфапрамысловасьці, якая ўчора адкрылася ў Маскве, і на якой стаіць даклад Белторфу, павінна сказаць сваё слова аб торфапрамысловасьці БССР.

Я. ФАЛЬКО.

Максымальна скарыстаць апошнія дні

На торфазаводах БССР зараз канчаецца вывазка торфу. Яшчэ нескалькі дзён і дарога будзе сапсавана настолькі, што вывазка стане зусім немагчымай. Таму, на тых торфазаводах, дзе думалі, што зіма працягнецца яшчэ месяцы 2, зараз імкнуцца скарыстаць усе магчымасьці для максымальнай вывазкі.

У якім становішчы знаходзіцца вывазка торфу? Праграма вывазкі на ўсіх 13 торфазаводах выкавана на 45 пытаньня на 56,5 проц. Цалкам скончылі вывазку толькі 4 заводы: «Чырвоны тарфяніх» (Віцебск), «Капектыўная праца» (Клімавічы), «Пралетары» (Дрэтунь), «Закрашынскі мох» (Рэчыца). Набліжаецца да выкананьня плану вывазкі торфазавод «Ленінскі шлях» (Выхаў), «Зьвязда» (Глуск), «1 мая» (Чашнікі).

Значнае невыкананьне плану вывазкі ёсьць як раз на найбольш буйных торфазаводах. З нявывезеных 118 тыс. тон за добрускім торфазаводам «Шлях сацыялізму» ёсьць запазычанасьць у 47 тыс. тон, за Асінторфам — каля 30 тыс. тон і на торфазаводзам «Чырвоны Кастрычнік» (Барысаў)—каля 16.000 тон. Асінторф мае поўную магчымасьць працягваць вывазку і пасьля растаяньня сьнегу, бо вузкакалейка падыходзіць аж да самых балот. Значна горш справа стаіць на добрускім торфазаводзе, дзе амаль увесь торф знаходзіцца на балоце, далёка ад вузкакалейкі. Такое становішча стварылася ў выніку значнага-нядбайных адносін адміністрацыі добрускай папяровай фабрыкі «Герой працы» і торфазаб'яднаньня да выкананьня праграмы вывазкі. Справа ў тым, што фабрыка «Герой працы» будуе транспарцёр для механічнай дастаўкі торфу з балота. Гэты транспарцёр павінен быў быць гатовы яшчэ ў пастрычніку мінулага году. Аднак, у сувязі з адсутнасьцю троса, набудова транспарцёру затрымалася да сёньняшняга дня і зараз яшчэ транспарцёр не гатоў. Торфазаб'яднаньне ў пастрычніку мінулага году, бачачы, што на транспарцёр спадзявацца няма чаго, прапанавала адміністрацыі фабрыкі заключыць дагавор на вывазку торфу гужом. Адміністрацыя фабрыкі згадзілася. «Хутка будзе гатоў транспарцёр, навошта перапочваць на бурманкі», — заўважыла адміністрацыя фабрыкі. Адміністрацыя фабрыкі разлічвала, што калі нават набудова транспарцёра спазьніцца, можна будзе карыстацца часова дапенцкім вуталем. Але надзеі адміністрацыі фабрыкі не апраўдаліся. Транспарцёр не гатоў, дапенцкага вуталю няма — і фабрыка зараз цярпіць вялікія прастоі з-за недаставкі апалу.

У хуткім часе транспарцёр будзе гатоў. Але справа гэтым не канчаецца. На некаторай адлегласьці ад транспарцёру праведзена вузкакалейка, на якой торф падвозіцца ня самага транспарцёру. Але да вузкакалейкі падвезена ня больш 13 тыс. тон торфу, увесь астатні торф — асноўная маса — ляжыць на палёх сушкі, на адлегласьці каля кілометру ад бакавой вузкакалейкі. Каб падвезьці торф да вузкакалейкі патрэбны былі штодзённа 1.000 фурманак, а фактычна прадавала ня больш 250. У апошнія дні толькі было мабілізавана фурманак 500. Такім чынам, значная частка торфу застанецца на палёх сушкі, што стварае дадзе труднасьці: па-першае, пазбаўляе фабрыку патрэбнай колькасьці апалу, па-другое, значная плошча палёў сушкі будзе занята нявывезеным торфам.

Віна за такую работу падае таксама на адміністрацыю торфазаводу «Шлях сацыялізму». Доўгі час завод застаўся без усякага кіраўніцтва. Дырэктара цэлых 20 дзён ня было на заводзе. Старшыня заўкому шмат часу патраціў на вярбоўку рабочай сілы, а сакратар парткалектыву зусім паехаў у школу. Такім чынам, 400 рабочых торфазаводу і 75 фабзавучнікаў засталіся без кіраўніцтва «стрыкутніка». Аб тым, што шмат залежыла ад ініцыятывы кіраўніцтва торфазаводу, сьведчыць наступны факт. Калі выяўіўся прарыў у вывазцы торфу, школа фабзавуча палкам сябе мабілізавала на ліквідацыю прарыва. Па ініцыятыве фабзавуча была пракладзена бакавая вузкакалейка, па якой самі фабзавучнікі пачалі інтэнсыўную вывазку торфу да галоўнай вузкакалейкі. Не спаткаўшы падтрыманьня адміністрацыі фабрыкі «Герой працы», фабзавучнікі самі арганізавалі брыгады гасьляроў, зрабілі вагаэткі і, упрэшчыся ў іх, вывезьлі некалькі тысяч тон торфу. Толькі ў апошні час, упэўніўшыся ў каштоўнасьці гэтай ініцыятывы, адміністрацыя набыла каня для палягчэньня работы фабзавучнікаў.

Яшчэ горшае становішча мы маем на барысаўскім торфазаводзе «Чырвоны Кастрычнік». Замест 400 фурманак увесь час прадавала ня больш 50-100 фурманак. У апошні час да торфазаводу прыманаван Смалявіцкі раён, але патрэбнай колькасьці фурманак ён ня даў. Пры адсутнасьці вузкакалейкі і налічваньні значнай колькасьці нявывезенага торфу (каля 16 тыс. тон), трэба сказаць, што стварае пагрозу для прадпрыемстваў Барысава.

Таксама значны адмоўны ўплыў на вывазку торфу мела зацяжка з вырашэньнем пытаньня аб прэміраваньні вовыручкаў. Толькі ў апошні час пытаньне для выдачы прэмій возчыкам розных кавіку будзе выдана тавараў на значную суму, з якой у сярэдзіне будзе выдана тавараў на 21 тыс. рублёў, у красавіку — на 17 тыс. рублёў.

Сёньня вывазка торфу яшчэ працягваецца. Але ўжо засталіся лічаныя дні. Трэба скарыстаць усе магчымасьці для максымальнай падвозкі торфу да нагрузачных месц.

Лепшыя ўдарнікі Менскага чыг. вузла машыніст ШАКАЛІДА і яго памочнік ІВАНОЎСКІ.

Прарыў на Асінторфе

Справа з вывазкай на Асінторфе цяпер пагаршаецца. Каля 50 проц. торфу ляжыць яшчэ на балоце. І гэта ня гледзячы на тое, што сэзон торфараспрацоўкі вак наближаецца з кожным днём. Невыкананьне плану вывазкі вельмі шкодна адаб'ецца на часьпіхтовым разгортваньні работ, бо торф, што застаўся на балоце, займае палі сушкі, патрэбныя для новага торфу.

Прычыны невыкананьня плану вывазкі зводзяцца да наступнага. Працэс паравозаў, недахват вагаэтак, недобраякасны рамонт іх, абязьлічка, адсутнасьць сацспаборніцтва і ўдарніцтва па мін пагрузачнымі і паравозынмі брыгадамі і г. д.

Дырэкцыя торфазаводу, замест ямі ной дзелавой работы, займаецца шаніро ваньнем цытаніцкай.

Для ўзмацненьня вывазкі торфу трэба ў самым хуткім часе зьнішчыць абязьлічку і перавесьці брыгады на спарную яду, палепшыць якасьць рамонту паравозаў і вагаэтак, наладзіць сацспаборніцтва і ўдарніцтва, перабудаваць работу вытворчых нарад на адкаведных прафсаюзах і ўзьняць на належную вышыню палітыка-выхаваўчую работу сярод работых.

Жуцік.

Торфазавод імя Даўмана да сэзону ня рыхтуецца

Торфазавод імя Даўмана (ст. Бобаўгаеньня прозвае выкананьне прамфінплану. За мінулы гаспадарчы год завод выканаў свае праграму на 50 проц., з тэтым годзе будзе яшчэ менш. На заводзе нямы ніякага тэхнічнага нагляду. У выніку, 16 лютага на заводзе здарылася аварыя. Будаўніцтва таксама адвядзецца без тэхнічнага кіраўніка. Тэхніка-будаўніка адклікалі на чытунку, а дасьпітэка насылаюць на работу ў каапэрацыю. Для вярбоўкі рабочай сілы ўжылі нейкага Леднёва, які суседзіцца з вычытывае з калгасу. Гэты Леднёв зараз разьязджае па вёсках, п'янствуе і выдае сябе за ніякага начальніка. Сельсавет даводзіў аб гэтым да ведамы заводакіраўніцтва і РСІ, але ніякіх мер ня прынята.

Загадчык гаспаркі Міхайлаў ніяк дапрыкаўных гропы на вёцер. За паравозку 24 кубаметраў сухіх дроў з цэнтральнага складу на адлегласьці паўкілометра ён плошчэ 27 рублёў, калі, згодна расцэнкі, трэба заплаціць ня больш 11 рублёў. Яд, прыведзены з возера, каштуе ў 2 разы даражэй нармальнага. На вывазку трох кубаметраў ёлку патрачана 13 дзён.

Работнікі заводу ад бязьлейшасьці разьязджаюць па розных камандыроўках. За абсталяваньнем для заводу езьдзілі на віцебскі торфазавод больш 15 разоў.

Спэцыяліста ляецца таму, каму па каліцтвам ды дзень ня трэба. Балотныя колькі на работу без спэцыяліста, а загадчык гаспаркі апранае з ног да галавы конюху, якія яго разьвозяць.

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва на заводзе адсутнічаюць. Няма ніводнага ўдарніка. Торфны камітэт не перабудаваў сваю работу ў адпаведнасьці з пёдтэзісам стварам да вытворчасьці». Таксама слабае кіраўніцтва з боку Белторфу. Партыйная і камсамольская ячэйкі бязьдзейнічаюць - Сэзон набліжаецца, а мы да яго зусім не падрыхтаваліся. Работа ідзе самацёкам.

Рабочы.

З кастрычніка ніводнага вагону піламатар'ялу

Торфазавод «Капектыўная праца» (Клімавічы) шосты раз зварочваецца да Белторфу з просьбай даць нарад на піламатар'ялы, з-за адсутнасьці якіх зрываецца набудова жыцьлёвага памяшканьня для рабочых.

Торфазаводу патрэбна 250 кубаметраў дошак. Будынкі для рабочых без вокнаў, столі і падлогі і няма ніякай магчымасьці разьмясьціць там 600 рабочых, якіх з'ехаў чакае у пачатку мая.

Нарад раглаўскаму лесазаводу на 50 кубаметраў піламатар'ялу ня выканан. Ня выканан таксама нарад на столькі-ж клімавіцкім рамкамбінатам.

Такім чынам, калі на працягу бліжэйшага часу лесаматар'ял ня будзе адгружана, торфазавод да сэзону гатоў ня будзе. З кастрычніка 1930 году завод не атрымаў ніводнага вагону піламатар'ялу.

Аб партыйнай і масавай рабоце ў цэху і брыгадзе

Пастанова ЦК УсеКП(б). ад 21 сакавіка 1931 году

1. Ажыцьцяўляючы дырэктыў XVI з'езду і ЦК УсеКП(б) аб пагарше партарганізацыі тварам да вытворчасьці і перанесьці цэнтру цяжару партработы ў цэх і брыгаду ячэйка «павысіць ролю партарганізацый на ўсім гасподарча-палітычным жыцьці прадпрыемстваў, забясьпечыць далейшае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва сярод шырокіх рабочых мас, забясьпечыць далейшы вялізарны рост партыі за лік рабочых в вытворчасьці.

2. Побач з гэтымі дасягненьнямі ЦК канстатуе, што пастанова XVI партызьезду аб пагаршэньні ўдзельнасьці ў сацспаборніцтва камуністаў і камсамольцаў у значнай ступені засталася невыкананай. У той час, як на перадавых заводах («АМО», Электразавод, завод імя Сталіна ў Ленінградзе, завод імя Кастрыцкага і Леніна—у Днепрапятроўску, Маскоўская папяровая фабрыка і інш.) сацспаборніцтвам ахоплена 90-95 проц. камуністаў, на іншых радзе іншых прадпрыемствах (Ижаўск, Нижнядзенск і г. д.) у ім прымае ўдзел усяго тольки 50-60 проц. камуністаў. ЦК прапануе крайкомам, абласным камітэтам і ЦК нацкомпартый, а таксама райкамам, заводкім парткамітэтам і ячэйкам спаўна ў самы найкарацейшы тэрмін адмыслоўленьня дырэктыў XVI партызьезду аб пагалоўным удзельнасьці камуністаў і камсамольцаў у сацспаборніцтве і ўдарніцтве, а таксама павесьці рашучую барацьбу з інша-ўдарніцтвам, у першую чаргу супроць камуністаў і камсамольцаў. Сапраўдны і пагалоўны ўдзел камуністаў і камсамольцаў у сацспаборніцтве і ўдарніцтве павінен выначацца выкананьнем вытворчых паказьнікаў цэху і брыгады ў цэлым, для чаго трэба пачаць выстарчальны пачэрпны ўсіх вытворчых паказьнікаў, арганізаваць сыстэматычную праверку і сымітаранерку тых, што спаборнічаюць. Толькі ў рэзультаце сапраўднага правядзеньня ў жыцьцё сэтых мерапрыемстваў, а ня, як гэта мае месца на масавых прадпрыемствах, можна будзе дабіцца на справе поўнага сапраўднага забясьпячэньня з боку партарганізацыі кіраўніцтва справай сацспаборніцтва і ўдарніцтва сярод шырокіх пралетарскіх мас, а таксама далейшага разгортваньня ўдарніцтва, паляпшэньня якасьці работы ўдарнікаў і ўзьняцьця ўдарнага руху і сацспаборніцтва на вышэйшую ступень. Улічваючы сушчарчываюць зацяпак работы вытворчых камун і мэтазгоднасьць іх існаваньня, ЦК даручае арбінстру ЦК, крайкомам, абласным камітэтам і ЦК нацкомпартый вывучыць вопыт работы вытворчых камун з мэтай выяўленьня, наколькі яны сябе выраўдалі, як форма сацспаборніцтва.

3. Работа вытворчых нарад павінна быць нарэшце чынам перабудавана пад кутом забясьпячэньня выкананьня прамфінпляну, разьвіцьця і замацаваньня справы сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Партарганізацыі павінны забясьпечыць актыўны ўдзел у вытворчых нарадах лепшых ударнікаў—беспартыйных, камуністаў і камсамольцаў і дабіцца, каб вытворчыя нарады сапраўды сталі на чале вытворчай актыўнасьці рабочых і сталі на справе арганізатарамі ўдарнага руху. Парторганізацыі на вінны павесьці рашучую барацьбу за рацыяналізацыю рабочых прапаноў, разгледжаных і прынятых на вытворчых нарадах, ЦК прапануе перанесьці на ўсе прадпрыемствы апрацаўны свае вопыт работы групавых і зьменных вытворчых нарад, а таксама вопыт спэцыяльных вытворчых нарад рабочых вядучых прафесій, ліцейнікаў, сьлесароў і г. д.).

4. ЦК патрабуе ад партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый максымальна разгарнуць работу за тэхнічную ўзброенасьць рабочых і кіруючых кадраў не прадпрыемствах, для чаго практыкаваць вузлы-заводскія школы, цэхавыя курсы, брыгадныя гурткі на павышэньні вытворчай кваліфікацыі, прыцягваючы да гэтай работы заводзкіх спэцыялістаў. На чале арганізацыі выканьняў барацьбы за тэхнічную пісьменнасьць рабочых, павінны стаць камуністы і камсамольцы-спэцыялісты, прыцягваючы для гэтага беспартыйных інжынэрна-тэхнічных пэрсонал прадпрыемстваў, а таксама спэцыялістаў, якія працуюць у навуковых інстытутах і гаспадарчых органах. Работа партарганізацый на вытворчасьці павінна быць накіравана на бязумоўнае ажыцьцяўленьне прыняцьцяў адзінаначальня. ЦК прапануе ліквідаваць і ў наступным не дапускаць арганізацыі розных «штабаў» і «кампанейскіх камісій» пры парткомах і ячэйках (заводы Ма Пятроўскага і Леніна ў Днепрапятроўску, завод «Гэс» № 1 і інш.), бо гэта на мінае ход кіраўніцтва і яго апаратна-тэхнічныя функцыі і зьбіваецца грубым парушэньнем адзінаначальня. Адначасова разгарнуць шырокую крытыку ўсіх заводзкіх і цэхавых адміністратараў, якія не ажыцьцяўляюць адзінаначальня, хаваюцца ад адказнасьці за пазічная пралетарскай грамадзянскі (ня у вазачным цэху электразаводу, дзе брыгадары не назначаюцца, а выбіраюцца) і ня змогуць злучыць кваліфікаваную дысцыпліну на вытворчасьці з шырокім разьвіцьцём творчага пачыну рабочых мас, з упатрэбленьнем іх у кіраўніцтве вытворчасьцю.

5. Для забясьпячэньня правядзеньня ў жыцьцё ўсіх партыйных дырэктыў і, у першую

ШКЛОЎСКАЯ МТС, КАЛГАСЫ „АСЬВЕТА“, „ЗЬВЯЗДА“

ГАТОВЫ ПА-БАЛЬШАВІЦКУ СУСТРЭЦЬ ВЯСНУ

Неадкладна скончыць давядзеньне пасеўных плянаў да двара

Большасьць калгасаў скончыла падрыхтоўку

ШКЛОЎ.

У Шклоўскім раёне з 15 па 26 сакавіка была праведзена праверка падрыхтаванасьці калгасаў, МТС і аднасобнікаў да веснавой сяўбы.

Праверка паказала, што некаторыя калгасы да нечага часу яшчэ не адрамантавалі поўнасьцю сельска-гаспадарчага інвэнтару, не забясьпечылі сябе насеньнем. Выявілася, адначас, што большасьць калгасаў поўнасьцю гатовы да выхаду ў поле.

Калгас імя Валадарскага па сустрэчным плане павялічыў план засеву на 35 гектараў, калгас «Поўны шлях» — на 18 гэкт.

23 сакавіка Шклоўская МТС арганізавала пробны выхад трактараў і прычэпнога інвэнтару ў поле. Выход даказаў, што МТС поўнасьцю падрыхтавана да пачатку сяўбы. Новыя рунныя-калгасьнікі, якія пасьпяхова скончылі курсы, добра кіруюць машынамі.

Пробны выхад МТС Шклоўшчыны пры актыўным удзеле рабочых заводу «Спартак», прафсаюзных арганізацый, калгасьнікаў і аднасобнікаў, якія прышлі ўдзел у агляндзе гатоўнасьці МТС, ператварыўся ў сапраўднае сьвята працоўных мас.

Калгас „Зьвязда“—у першых радох

ВУЛА. (НАШ КАР.). КАЛГАС «ЗЬВЯЗДА», УСЬВЕЙСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, ПАКАЗВАЕ ПРЫКЛАД УЗОРНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ. 10-ГА САКАВІКА КАЛГАС БЫЎ ПОЎНАСЬЦЮ ГАТОВЫ ДА ВЫХАДУ Ў ПОЛЕ ДЛЯ ПАЧАТКУ СЯЎБЫ. ВЫТВОРЧЫ ПЛЯН СКЛАДЗЕН, АГАВОРАН І ДАВЕДЗЕН ДА КОЖНАГА КАЛГАСЬНІКА.

НАСЕНЬНЯ ФОНДЫ ОСЫПАНЫ, ІНВЭНТАР І ЗБРУЯ АДРАМАНТАВАНЫ, СМАЗАНЫ І ПРЫМАЦАВАНЫ ДА КОНЯЎ. ЛЮДЗІ РАЗЬМЕРКАВАНЫ НА БРЫГАДАХ, ЯКІЯ ЎЖО МАЮЦЬ ЦВЁРДЫЯ ЗАДАНЬНІ ПРАЦЫ ПРАЦЭ ЯК ПЛЯНЫ ПРАЦЭ ПА ЧАСЕ СЯЎБЫ.

СТРАХАВЫЯ ФОНДЫ ФУРАЖУ ЛЯЖАЦЬ НЕПАРУШАНЫМІ.

СКОНЧАНА ЗАГАТОЎКА І ВЫВАЗКА МАТАР'ЯЛУ ДЛЯ БУДАЎНІЦТВА СЬВІНАРНІКА.

УСЯ РАБОТА Ў КАЛГАСЕ ВЯДЗЕЦЦА НА АСНОВЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА. ЛЕПШЫЯ КАЛГАСЬНІКІ АТРЫМАЛІ ПРЭМІІ Ў 150 РУБ.

КАЛГАС «ЗЬВЯЗДА» ПАБУДАВАЎ УЛАСНЫМІ СІЛАМІ ЦАГЕЛЬНЮ, ЯКАЯ ЎЖО Ў ГЭТЫМ ГОДЗЕ ДАСЬЦЬ 300 ТЫС. ШТУК ЦЭГЛЫ ДЛЯ КАЛГАСАЎ ВУЛЬШЧЫНЫ.

МІКУЦКІ.

Мінэральныя ўгнаеньні ня вывозяцца

ЖЛОБІН. (Наш кар.). Падрыхтоўка да веснавой сяўбы на раёне праходзіць вельмі марудна. На 24 сакавіка план вывазкі насеньня выкананы толькі на 46 проц. Смалянщкі сельсавет толькі зараз прыступіў да вывазкі насеньня і рамонту інвэнтару.

Рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтару на раёне поўнасьцю яшчэ не закончан.

Райкалгасаюз да гэтага часу не забраў утаеньня са станцыі Жлобін, якое даўно ўжо прыбыла і ляжыць пад адкрытым небам.

Слабая падрыхтоўка да веснавой сяўбы адбіваецца на разгортваньні калектывізацыі. На 20 сакавіка на раёне калектывізавана толькі 14,3 проц. гаспадарак.

Машніцкі.

Пасеўныя пляны яшчэ ня складзены

СЛОЦКІНА. ТЭМПЫ ПАДРЫХТОЎКІ ДА СЯЎБЫ НА РАЁНЕ НЕ ЗАБЯСПЕЧВАЮЦЬ ВАЛЬШАВІЦКАГА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ДРУГОЙ КАЛГАСНАЙ ВЯСНЫ. У РАДЗЕ СЕЛЬСАВЕТАЎ ПАСЕЎНЫЯ ПЛЯНЫ ЯШЧЭ НЕ ДАВЕДЗЕНЫ ДА ПААСОБНЫХ КАЛГАСАЎ І ВЯСКАЛІК ДА ГЭТАГА ЧАСУ ЯШЧЭ НЯ СКЛАДЗЕНЫ.

МАШЫНА - ТРАКТАРНАЯ СТАНЦЫЯ, ЯКАЯ ЎЖО Ў РАЁНЕ, НЕ РАЗГАРНУЛА РАБОТЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА СЯЎБЫ. ДАГАВАРЫ ПАМІЖ МТС І КАЛГАСАМІ НЕ ЗАКЛЮЧАНЫ. ВЫТВОРЧЫ ПЛЯН ПРАВЯДЗЕНЬНЯ СЯЎБЫ МТС НЕ СКЛАДЗЕН. ТАКАЯ РАБОТА МТС СТВАРАК ПАТРОЗУ, ШТО ЎСКЛАДЖВЕЦЬ НА ЯЕ ЗАДАЧЫ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ НЕ БУДУЦЬ ВЫКАНАНЫ.

РАЙКАЛГАСАЮЗ ПЫТАНЬНЯМІ ЗМАЦАВАЎНЯ КАЛГАСАЎ, АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦЫ, РАЗГОРТВАНЬНЕМ САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА НЕ ЗАЙМАЕЦЦА.

ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЕ РАЗЬМЯРКОВАН УРАДЖАЙ Ў КАЛГАСАХ «ШЛЯХ ЛЕНІНА», «БАЛЬШАВІК», «1-ГІ КАСТРЫЧНІК».

МЯТЛА.

„Да вясны далёка— справімся“...

МАЗЫР. Калгас «Зьвязда», Зеляноўскага сельсавету, не вядзе ніякай работы па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Інвэнтар і сельска-гаспадарчыя машыны не рамонтуюцца. Плугі і капёсы ляжаць пад сьнегам. Трактар і трактарны плуг стаяць пад адкрытым небам і не рамонтуюцца.

У калгасе арганізавана кузьня, якая не працуе з-за адсутнасьці вугляю. У той-жа час за 7 вёрст ад калгасу ляжыць на заводзе спэцыяльна выпуканы для калгасу вугаль.

На запытаньне—чаму не рамонтуецца інвэнтар—старшыня калгасу Рахуба адказвае: «Гэта не ваша справа, да вясны далёка—справімся».

Апартуністычный бязьдзейнасьці праўленьня калгасу «Зьвязда» трэба прадухіліць (см.4).

А-бок.

Паўднёвыя раёны ганебна адстаюць

МАЗЫР. Калектывізацыя і падрыхтоўка да веснавой сяўбы на раёне праходзяць самацёкам. За апошнія два месяцы калектывізацыя вырасла ўсяго на 3,3 проц. Парт'ячэйкі і сельсаветы не ўдаляюць належнай увагі пытаньням разгортваньня калектывізацыі.

ПАСЕЎНЫЯ ПЛЯНЫ ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЕ ДАВЕДЗЕНЫ ДА ПАСЕЛІШЧ І ДВАРОЎ. Насенныя і страхавыя фонды складзены не па ўсіх калгасах. ДА СТВАРЭНЬНЯ СТРАХАВЫХ ФОНДАЎ ПА ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ СЭКТАРЫ ЯШЧЭ НЯ ПРЫСТУПЛЕНА.

Ачыстка насеньня па калгасах выканана на 90,5 проц., па індывідуальным сэктары — на 23,5 проц.

Значныя-марудна праходзіць абмен простага насеньня на гатункове. План абмену выкананы толькі на 4,7 проц.

Стварэньне фуражных і кармавых фондаў праходзіць вельмі марудна. У той-же час ня прымаецца ніякіх мер да эканомнага выдаткаваньня кармоў.

З-н.

ДОБРАЯ ПАДРЫХТОЎКА ДА СЯЎБЫ ВЫКЛІКАЛА ПРЫЛУ У КАЛГАСЫ

ЛЕЛЬЧЫЦЫ.

Работа па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы на аповшні тыдзень на раёне нераўномерна на бальшы тэмпы. Усе раённыя арганізацыі абвясьцілі сябе ўдарнымі на правядзеньні падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Прадаўжні ўсіх устаноў, а таксама камандыраваныя з цэнтру таварышы разьмеркаваны на брыгадах і прымацаваны да вобласных сельсаветаў на ўвесь перыяд веснавой сяўбы.

Пасеўныя пляны даведзены да калгасаў і амаль да ўсіх пасоўгчыкаў. Разгорнута работа на ачыстцы абожжа, якая на калгасах ужо скончана. Калгасы ўзяліся за стварэньне кармавых фондаў. Сельска-гаспадарчы інвэнтар і машыны поўнасьцю адрамантаваны. Райкамсаюзам завезены патрэбныя с.-г. машыны і патрэбная колькасьць хімікатаў.

У выніку разгорнутай работы па падрыхтоўцы да сяўбы процант калектывізацыі на радзе сельсаветаў узрос з 13 да 16 проц.

Ш-ль.

Старасельскія апартуністы скарачаюць пасеў тэхнічных культур

ВІЦЕБСК. (Наш. кар.).

У СТАРАСЕЛЬСКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ дрэнна рыхтуюцца да веснавой сяўбы. Есьць імкненьні скараціць пасеўныя плян. Асабліва горача бяруцца апартуністы за скарачэньне пасеву тэхнічных культур. ТАК, ЗАМЕСТ ВЫЗНАЧАНЫХ 149 ГЭКТ. КАНЮШЫНЫ, ПРЫНЯТ ПЛЯН СЯЎБЫ ТОЛЬКІ 96 ГЭКТ., ЗАМЕСТ 292 ГЭКТ. БУЛЬБЫ — ТОЛЬКІ 212 ГЭКТ.

Плян засьніі насенных фондаў выкананы на 40 проц. Кармавыя фонды зусім ня створаны. Ачыстка праведзена на 15 проц. Абмен простага насеньня на гатункове не праводзіцца. Сельска-гаспадарчы інвэнтар адрамантаваны толькі на 35 проц.

Па рыхтоўцы да сяўбы ў калгасе «ПЕРШАГА МАЯ» праходзіць таксама незадавальняюча, — замест зрэзыні 1.000 пуд вікі, засыпана 200 пуд. Насеньня гарохіны зубім не нарыхтавана. Збожжаачыстка праведзена на 75 процантаў, абмен простага насеньня на гатункове толькі цяпер распачаты. Да рамонту напёс і зброї яшчэ не прыступілі.

КАНТРАКТАЦЫЯЙ СЕЛЬСАВЕТ ЗАЙМАЎСЯ ТОЛЬКІ ФАРМАЛЬНА. Есьць рад пастаноў аб неабходнасьці правядзеньня кантрактацыі, але пакуль што вынікаў няма.

У калгасе пачалі пабудову маленькай фэрмы, на якую патрацілі 23.000 руб. (уся пабудова каштуе 28 тыс.). Цяпер бедуе адзіньне чамусьці спынілі пабудову, між тым аб прычыне спыненьня пабудовы ніхто ня ведае, а калгасьнікаў гэта пытаньне вельмі цікавіць.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.



Прыбыла новая партыя трактару.

У палоне самацёку і апартунізму

Падкулачнікі і апартуністы развальваюць калгасы

КОПЫСЬ. Падрыхтоўка да сяўбы ў Старасельскім сельсавеце праходзіць самацёкам.

Пасеўныя пляны на ўсіх калгасаў яшчэ не даведзены. Насенныя фонды ня сэпаны. Маладзьба не закончана — насеньне не вушчасьцца. У калгасе «Чырвоны Кастрычнік» начыстае пасавацца авёс, ён ляжыць пад адкрытым небам і гніе.

Угнаеньне, вызначанае для сельсавету, ляжыць у Копысі, а калгасьнікі яго не забіраюць, кажучы: «Нам копысь гною».

Жывёла і цягавая сіла ў калгасе знаходзіцца ў вельмі дрэнным стане. У выніку нескаторыя выдаткаваньня кармоў на многіх калгасах сельсавету ўжо не хапае кармоў. У калгасах «Зара», «Новае жыцьцё» ёсьць выпадкі падзяку кароў.

У калгасе «Бальшавік» калгаснікі-падкулачнікі Шастакоў, Кучаўскі і Белавусаў крадуць авёс і абменьваюць яго на гарэлку. Расхрадзены таксама і плугі. Усё гэта — вынік беставарасьці і падбайнасьці праўленьня калгасу.

Прамтаварыя і прадукты, якія калгас атрымлівае, разьмяркоўваюцца праўленьнем паміж сваімі і бальшамонымі. Наогул беднякі ў калгасе за апошнім месцы. Так, пры разьмеркаваньні ўраджаю беднякі не атрымалі аўса. Сакратар калгасу «Бальшавік» тлумачыць гэта тым, што ў беднякоў няма сьвіней, няма чаго карміць і таму авёс ім непатрэбен».

Бестаспадарчасьць і адсутнасьць належнага адпору кулацкай агітацыі пашкодзілі да аўтаму ў калгасах Старасельскага сельсавету.

Выяўленьнем і партарганізацыі разам павінны спыніць апартуністычную дзейнасьць кіраўнікоў Старасельскага сельсавету.

Брыгадзір ГЕНІН.

Барысаўшчына не зрабіла ніводнага кроку наперад

БАРЫСАЎ.

Вытворчыя мерапрыемствы да вясны выконваюцца дрэнна. Мінэральныя ўгнаеньні ляжаць на складах. Саўгасы і калгасы не прыступілі да іх вывазкі. Ніякіх мер да збору попелу ня ўжываецца.

Зусім дрэнна праходзяць загатоўкі насеньня. За апошнюю дэкаду не загатоўлена ні аднаго кіпа вікі, сарадэлі і пэлюшкі. Большасьць сельсаветаў да гэтага часу яшчэ не прыступілі да ачысткі насеньня. Выключэньнем аўтаўцца вёска Рапное, якая ачысьціла насеньне на ўсе 100 процантаў.

На складах рэмбазсаюзу вялікія залежы сельска-гаспадарчых машын і інвэнтару. Райкамсаюз і райкалгасаюз ня ўжываюць ніякіх мер да прасоўваньня гэтых машын у калгасы.

М.

Падрыхтоўкі да будаўніцтва не вядзецца

Сьвінагадоўчы саўгас «Вызваленьне» дрэнна рыхтуецца да другой бальшавіцкай вясны. Саўгас пасеяў засеяць 600 гэкт. Толькі цяпер распачата ачыстка насеньня. Маладзьба не скончана.

На будаўніцтва асігнавана 600 тыс. руб. Для выканаўцаў гэтага плану патрэбна 4 тыс. кубамэтраў лесаматэрыялаў, але парадаў адпушчана на 1.700 кубамэтраў, вывезена-ж толькі 150-200 кубамэтраў.

У 1931 г. ніяк сьвіньматак павінен быць даведзен да 1.000, але цяперашні тэмп падрыхтоўкі да будаўніцтва сьвінарнікаў яго гарантуе выкананьня вызначанага плану разьмнажэньня сьвіньматак.

БРЫГАДА.

Сельсавет суцэльнай калектывізацыі

ПЛЕШЧАНІЦЫ. (НАШ КАР.). НЯДАЎНА НА РАЁНЕ БЫЎ АРГАНІЗОВАН ВЫЕЗД ПАРТЫЙНАГА АКТЫВУ НА СЕЛЬСАВЕТАХ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ПРАВЕРКІ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ І МАСАВАЙ РАБОТЫ ПА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ. АКТЫЎ РАЗАМ З КАЛГАСЬНІКАМІ І ЎДАРНІКАМІ ЗА ЧАС ВЫЕЗДУ КАВІЎСЯ ЗНАЧНЫХ ПОСЬПЕХАЎ Ў РАЗГОРТВАНЬНІ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ. ЗА ЧАС З 16 ПА 20 САКАВІКА Ў ІОНУ ІЧЫЯ КАЛГАСЫ УЛІЛІСЯ 181 БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКАЯ ГАСПАДАРКА.

НОВАЎСТУПІЎШЫЯ КАЛГАСЬНІКІ ЗЬВЯРНУЛІСЯ З АДОЗВАЙ ДА ЎСІХ БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ З ЗАКЛІКАМ УСТУПІЦЬ Ў КАЛГАСЫ.

УЗОРНЫ ПРЫКЛАД РАЗГОРТВАНЬНЯ КАЛЕКТЫЎНАГА РУХУ ПАКАЗВАЕ ГРУШАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ, ЯКІ КАЛЕКТЫВІЗАВАНЫ НА 88 ПРОЦ.

БУТОЛІН.

На ліквідацыю прарываў

АСІПАВІЧЫ.

Пленум Верайскоўскага сельсавету, Асіпавіцкага району, заслухаўшы адозву X зьезду савэтаў БССР, пастанавіў мабілізаваць сябе на ліквідацыю прарываў у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Пленум савету вылучыў 10 брыгад. Ужо дасягнуты канкрэтныя вынікі. У вёсцы Пратасевічах арганізаваўся калгас з 23 бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак.

К.

Да сяўбы гатовы

ЛЮБАНЬ.

Калгас «Асьвета» гатоў па бальшавіцку сустрэць вясну. Увесь інвэнтар адрамантаваны. Насеньне адсартавана на 100 процантаў. Замест 34 тон угнаеньня, якія выкананы паводле плану, загатоўлена 40 тон.

Планы сяўбы збожжавых і тэхнічных культур абмеркаваны на сходзе калгаснікаў яшчэ тры тыдні назад. Калгасам высунуты сустрэчны плян засеву 113 гэктараў пад тэхкультуры і збожжа.

Уся плошча засеву закантрактавана.

Партыйная ячэйка супольна з энтузіястамі калгасу праводзяць сыстематычную масавую работу па арганізацыі новага калгаснага прыліву.

За час падрыхтоўкі да сяўбы ў калгас уступіла 63 бядняцка-серадняцкія гаспадаркі. Арганізаваны дзьве ініцыятыўныя групы.

МАКАРЭВІЧ.

Тэзісы т. Якаўлева выклікалі новую хвалю калгаснага прыліву

Ва ўсіх парт'ячэйках ЛОЕЎСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ прапрацаваны тэзісы тав. Якаўлева па пытаньнях калгаснага і саўгаснага будаўніцтва. У работах па распрацоўцы прымалі актыўны ўдзел шырокія масы калгасьнікаў і аднасобнікаў бедняцкай і серадняцкай.

Партарганізацыя мабілізавала раённы актыў на правядзеньне агульных сходаў калгасьнікаў і аднасобнікаў, прысьвечаных прапрацоўцы тэзісаў. Партарганізацыя, калгасьнікі і шырокія масы аднасобнікаў аднадушна ўхваляюць тэзісы і падтрымліваюць, што посьпехі калгаснага будаўніцтва зьявіліся простым разультатам няўхільнага змаганьня нашай партыі за акыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, за акыцьцяўленьне пастаноў XVI зьезду УсеКП(б).

У разультаце палупрызыцыі тэзісаў па раёне ўзьнікаецца новая хваля калгаснага прыліву. Паводле далёка няпоўных вестак, у дэкаду станічнага прыбыву ўступіла ў калгасы каля 170 гаспадарак.

Прапрацоўка тэзісаў увязваецца з практычнай работай па акыцьцяўленьні дырэктыў ЦК УсеКП(б) і СНК адносна кантрактацыі яравых пасеваў. Разгортваецца масавая работа па падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны і ўвязваецца з разгортваньнем калгаснага будаўніцтва. У першай дэкадзе сакавіка мы мелі рад сельсаветаў, якія ахоплены калектывізацыяй на 70 проц. Парадзільскі сельсавет калектывізаваны на 70 проц., Ручаўскі — на 44,6 проц., Уборкаўскі — на 45 проц., Дзераньскі — на 36 проц. і г. д. За апошнія дні арганізавана 6 новых калгасаў.

Н. Р.

Барацьба за працоўную дысцыпліну—

БАРАЦЬБА ЗА ЗДАРОВЫ ТРАНСПАРТ

Праз сацыялістычнае спаборніцтва—да высокай сацыялістычнай дысцыпліны працы

Нізкая працдысцыпліна зрывае графік руху

Ленінская фармулёўка аб тым, што на транспарце плацна быць значна больш жорсткая працэсная дысцыпліна, чым у прамысловасьці, вызначае і тыя задачы, якія стаяць у гэтай галіне. Зусім справядліва, чаму ў вадозьве ЦК і СНК аб транспарце як галоўная падкрэсьлена патрэбнасьць павышэньня працоўнай дысцыпліны на транспарце.

Слабая працоўная дысцыпліна, навыкі брыгады на работу пры адпрацоўцы цягніка прыводзяць графік руху, парушаюць спаранцу. Такіх выпадкаў на Гомельскім вузле было тры.

На сталінскім складзе ст. Гомель, з прычыны нізкай працоўнай дысцыпліны, затрымліваецца нагрузка саладу на паравозы, а гэта вялікае зрыў сваячасовай адпраўкі цягнікоў. Праўда, за апошні час наладзілася некаторы зрух у пытаньні працдысцыпліны. У студзені было 78 выпадкаў парушэньня працдысцыпліны з боку паравозных брыгад, а ў лютым—55. Зусім відавочна, што і гэта лічба сьведчыць аб далёка нездавальняючым становішчы. Ёсьць значнае павялічэньне адміністрацыйных спагнаньняў да адміністрацыйна-тэхнічнага парсаналу. У студзені было 16 выпадкаў, у лютым—38.

Слабая працдысцыпліна тлумачыцца тым, што вакол парушэньняў не ставраецца грамадзкая думка. Прафсаюзныя арганізацыі не выкарыстоўваюць падходных выпадкаў для мабілізацыі рабочых на ўзмацненьне працоўнай дысцыпліны. Няма штодзённага ўліку парушэньня. Таварыскі суды працуюць надзвычай дрэнна і свае не карыстаюцца ніякім аўтарытэтам.

У мэтах барацьбы з прагулямі за апошні час на ст. Гомель склікаецца канфэрэнцыя прагульшчыкаў. На канфэрэнцыях з усёй вычэрпальнасьцю над крэсьлюецца дзяжасьць віны прагульшчыкаў у справе выкананьня працэфэрэнцыі. Канфэрэнцыі выносяць адпаведныя пастановы аб рашучым выкананьні прагулаў і ўзмацненьні працоўнай дысцыпліны. Адначасова станцыя выкананьне аб узмацненьні культурна-масавай работы серод прагульшчыкаў.

Б. Зельманоў.

Р. Файнбэрг.

За паравоз

Лічбы і зводкі зьбіралі антэны,
Гудзелі гудкі, сьпявалі сірэны
І сьпеў іх трывожным сьпынатам быў:
«На транспарце пра-рыў!»

З нагазінай, упартаю воляю людзі,
Ў адказ на трывожны сьпынальны прызыў,
Рашуча сказалі: «Так ня будзе,
Мы ліквідуем, мы зьнішчым прарыў»!

. . . . . .

Мы змагаліся за жыцьцё, за шчасьце,
Мы бараніці пралетарскі пёс.
На новы фронт нас выслала ўчасьцы,
Мы змагаемся за паравоз.

З калектывам, з грамадзою -валатам
На здужае змагацца і мэталь.
Пад цяжкім пад нашым мэлатам
Гнецца мэлаторпівая сталь.

Мы ў вопратку стаялёную
Апраюем стары паравоз,
Каб хутчэй дарогай новаю
Ён краіну ў будучыню ваз.

Грамадой па прарыва ўдарым мы.
На аповшні штурм барыцад
Мы пойдзем брыгадамі ўдарнымі,
Энтузіязм наш упілочым у варштат.

Шмат хто ў час апошняга змаганьня
Нам стараецца перашкаджаць,
Іх мы зможам, без саганьня,
З нашага шляху ўбраць.

. . . . . .

Лічбы і зводкі зьбіралі антэны
Гудзелі гудкі, сьпявалі сірэны
Мільны сказалі: «Так ня будзе!»
А гэта—з упартаю воляю людзі.

Імкненьні зьліліся ў адзін парыў:
Ліквідаваць і зьнішчыць прарыў!

ФЭВ КРАЎЦОЎ.

За дысцыпліну працы

Апошні працэс выпуску паравозаў — афарбоўка. Калі высахнуць афарбаваныя часткі, паравоз шчыпецца для вясьнастраціцы. З гэтага часу ў абязьпіка паравозам пераходзіць машыністу, яго памочніку і кацагару. Здароўе паравоза, нармальная і бясьпрабойная работа залежыць від прыняцьця яго ў чатэнце, ад пазбаўленага шанцу.

Пры абасобленай ляндзе афарбоўка паравозу, шаравіцкіх шкрэм, не вычышчалася, у выніку — яны ператвараўся ў грязь. Паравоз пачынаў хварэць. Мінімальная колькасьць дробных неаваньняў патрабавалі міжпланкавага дробнага рамонту, але рамонт ня выконваўся. На бяло нарсанальнай адказнасьці за здароўе і стан паравозу.

Была абязьлічка.

Адсутнасьць адказнасьці за паравоз скарачала яго эксплюатацыйнасьць.

У рамонтных майстэрнях, дзе рабіўся больш буйны рамонт паравозаў, вынайшла ня чысьцілася. Чысьцілася толькі там частка, дзе проба было пасьпрабуць запасць, ці палажыць лапку.

Абязьлічка вялічвала на плечы сьвецкіх дарогах. Дырэктыва ЦК партыі і СНК з усімным сустрэчнага і ідэрнымі чыгуначнікамі і ніжэйшыя праводзіцца ў жыцьцё.

Менскія чыгуначнікі значнасьцю перайшлі на спаравую сяку.

Брыгада помсамольца Шаскіна шырмела шкрэм. Да гэтага-ж паравозу прыкмацавана брыгада машыніста Досіна. Брыгады, адпрацоўваючы свой рабочы дзень, рабілі рамонт свайго паравозу. Пры пару дзёя паравоз бліскуў. Фарба, накладзеная яшчэ заводы на корпус паравоза, зноў паказалася замест пластоў бруду і пошыці.

Брыгады Досіна і Кацьцюневіча выклікалі на сацыяборніцтва ўсе брыгады вузла на лепшы доклад паравоза. На сьцянах майстэрані і карпусоў паравознага дэпо бялелі лёзкі выклікі:

«Упічаючы недахват машыністаў у сувязі з адпускамі, мы зрабілі адну паездку ў кварыцць трэцяга разьлічага году пяцігодкі. Выклікаем пасьледаваць нашаму прыкладу паравозныя брыгады Менскага вузла».

Факт з разу подобных брыгадаў машыніста Мінава зарыхала з дарогі і даведаліся аб тым, што, замяшчыць іх машыніст Саломенка, хворы. Мінаў не згадзіўся, каб на паравозе сьвецкім перэрмацавала брыгада і, не сьпатаўшы, зноў пасхаў на свае паравозе.

Сьмяя не баз урода. У сямі мяжнікі заўсёды ёсьць і такія, як партыец Напацкі, які ніколі у чысьтыі ідзе ня адну паравоза. Калі яму на гэта паказалі Напацкі заўважае:

— Паверце-ж, чудакі, што грязь шкодзіць на шкодзіць...

Няма сумненьня, што за такія адносіны да работы і «жарты» Напацкі не заслугоўвае назвы камуніста.

Для такіх, як Напацкі, на вузьле створаны таварыскія суды, праз фільтр якіх рабочыя пранускаюць усіх парушэньні працоўнай дысцыпліны.

Тэтымі днямі таварыскі суд, разам з ударнікамі - чыгуначнікамі, разглядзе справу пяцёх ударнікаў Жука, Навановы, Аксючыца і Саўкіна за сыстэматычнае спаўзьненьне на працы. Жук і Навановы не скромніся прыходзіць на работу п'янымі. Суд вынесе ім суровую вымову — рабочыя ударнікі заявілі: «Калі гэта не дапаможа, выключым з члена прафсаюзу».

Дажурным на дэпо Аксючыцу, Саўкіну — вымова. Усе абвінавачаныя перад рабочымі прызналі сваю віну і дзі цьвёрдае абяцаньне прыкладна працаваць выправіць свае памылкі.

* *

Пры абязьлічцы самы дробны рамонт выклікаў выдаткаваньне сродкаў. Зараз гэтыя рамонты выконваюцца паравозным брыгадамі. Гэта дазваляе буйное псаваньне паравозаў. У выніку гэтага дасягнута эканомія і на іншых відах работы.

За люты месяц на падсмку для аточні паравозу плянам прадугледжана 600 руб., фактычна-ж выдаткавана 42 руб.

На рамонце аднаго пасажырскага вагону з'эканомлена 24 руб. 00 кап., на гэтым дзелкага сьледваньня па рамонтаў эканомія ў 48 руб. 54 кап. І рамонт спальных вагонаў замест 58 руб. абыходзіцца ў 46 руб. 17 кап.

Марудна яшчэ выпічваецца пробная жворных паравозаў. На сёньня колькасьць жворных паравозаў складзіць да 12 проц. Далёка ня выконваюцца ліміты выкарыстаньня на прабегу паравозных брыгад; ноў факт: на пасажырскім прабегу выкарыстаньне за люты ня выкананы на 8.213 клм., на таварным подвазкам — на 4.490 клм., на гаспадарчых — на 180 клм.

Чаму гэты прарыў яшчэ не ліквідаваны? На многіх вучастках работы няма правільнай расстаноўкі сіл. Адсутнічае распарадчасьць.

Пастанова ЦК і СНК, якая выказвае пяхкінную волю пралетарыяту — павінна безагаворачна і поўнасьцю быць выкананна. Рэспубліка Саветаў чакае з транспарту выразнай і бесьпераробнай работы.

А. Манькоў.

Адказ рабочых ст. Фарынава

НА ХЛУСЬНЮ АБ „ПРЫМУСОВАЙ ПРАЦЫ“ У СССР

Рабочыя паказалі ўзор бальшавіцкага гэраізму—за 2 гадзіны разгрузілі 20 вагонаў жалеза, чым папярэдзілі выплату 200 руб. золатам няўстойкі

Факт працоўнага гэраізму, які меў месца 9-га сакавіка на ст. ФАРЫНАВА—пешы адказ на хлусьню інтэрвентаў аб «прымусовай працы» ў СССР.

9 сакавіка о 9 гадз. ўвечары на станцыю прыбыў польскі цягнік з 20 вагонамі жалеза. Вагоны павінны былі быць разгружаны на працу адных сутак. Пры невыкананьні гэтага ў кожны неразгружаны вагон мы павінны плаціць ад 5 да 10 руб. золатам. Такім чынам, НЕСВАЯЧАСОВАЯ РАЗГРУЗКА 20 ВАГОНАЎ ПАГРАЖАЛА УПЛАТАЙ НЯЎСТОЙКІ КАЛЯ 200 РУБ. ВАЛЮТЫ.

Начальнік ст. ФАРЫНАВА даў загадку на 20 вагонаў ст. ПОЛАЦАК, але гэтай загадкі ня былі атрыманы вагоны і на заўтрашні дзень—9-га сакавіка. Замест вагонаў ст. ПОЛАЦК прыспала... сьнегагачышчальнік. Пасьля начальнік паўторных запросаў з боку начальніка ст. ФАРЫКАВА ст. Полацак выслала... адзін паравоз. ТОЛЬКІ ПАСЬЛЯ ПЯТАГА КАТЭГАРЫЧНАГА ПАТРАБАВАНЬНЯ, ЗА ДЗЬВЕ ГАДЗІНЫ ДА СКАНЧЭНЬНЯ ВЫЗНАЧАНАГА ТЭРМІНУ БЫЛІ АТРЫМАНЫ ВАГОНЫ.

Патрабавалася вялікая намаганьні сіл і энэргіі, каб папярэдзіць маркую трату залатой валюты. Рабочыя добра зразумелі вялікую важнасьць гэтага факту і заявілі:

«НІВОДНАГА САВЕЦКАГА РУБЛЯ НЕ АДДАМО З-ЗА НЕРАСПАРАДЧАСЦІ ПОЛАЦКІХ БЮРАКРАТАЎ І ШКОДНІКАЎ».

І 25 РАБОЧЫХ-ГРУЗЧЫКАЎ, НА ЧАЛЕ З ПАРТЫЙНАЙ ЯЧЭЙКАЙ УДАРНА, ПА-БАЛЬШАВІЦКУ УЗЯЛІСЯ ЗА ПЕРАГРУЗКУ ВАГОНАЎ.

Дзьве гадзіны гэройскай працы, якой, на якую здольны толькі рабочы савецкай краіны, папярэдзілі выплату няўстойкі.

Рабочыя-грузчыкі выканалі свой абавязак перад пралетарскай краінай, пі раз даказаўшы, што ў САВЕЦКІМ САЮЗЕ—НЯ ПРЫМУСОВАЯ ПРАЦА, ВЫСОКАЯ СЬВЯДОМАСЬЦЬ, АДДАНАСЬЦЬ АГУЛЬНАЙ СПРАВЕ ПРАЛЕТАРЫЯТУ, ТВОРЧЫ ЭНТУЗІЯЗМ ПРАЦОЎНЫХ РОБІЦЬ ТАКІЯ ЦУДЫ, НЯМА ЯКІЯ ЯНЯ ЗДОЛЬНА НІ АДНА КРАІНА Ў СЬВЕЦЕ. Такі гэраізм рабочых-грузчыкі ФАРЫНАЎКІ праяўляюць у ня першы раз.

Адпаведныя органы павінны зацікавіцца на чыёй віне з такім спазьненьнем былі паданы вагоны са ст. ПОЛАЦАК прыцягнуць вінаватых да адказнасьці. Рабочых, якія паказалі ўзор пытчыка сьвядомасьці і працоўнага гэраізму, трэба прэміраваць.

ГУРСКІ

Пакончыць з апартуністычнай недаацэнкай сацыялістычнага абмену практыкай

Дырэктыва... у стале

КІЛІМАВІЧЫ (НАШ. КАР.).

Клімавіцкі раён, пачаўшы выкуплю 171 «50-цітысячнікаў».

Ня гледзячы на тое, што дырэктыва з Беларкалгасцэнтру атрымана ўжо даўно, райкалгасаюз нічога ў гэтай справе ня робіць. Дырэктыва аб пасылцы «50-цітысячнікаў» ляжыць у стале сакратара райкалгасаюзу без руху. Каб крыкрыць сваю апартуністычную бязьдзейнасьць, сакратар райкалгасаюзу заяўляецца такім разважаньнямі: спры арганізацыі новых калгасаў мы вылучыні адзіных кіраўнікоў, дык жаваць зараз пасылаць старых калгасьнікаў у новыя калгасы».

Рад калгасаў раёну шчэ маладыя таварышчы не замацаваліся. Перадача вопыту з боку старых калгасаў новым даць-б ім значную дапамогу.

Клімавіцкому райкому КП(б)Б неабходна ўдарыць на тых, хто на практыцы праводзіць справа-апартуністычныя спрэвы.

А. В.

Поўная бязьдзейнасьць

ШКЛОЎ. (НАШ КАР).

Згодна разьвёрстцы Калгасцэнтру па ШКЛОЎСКІМ раёне трэба перакінуць сё старых калгасаў у новыя 114 ЧАЛ. Гэту разьвёрстку райкалгасаюз атрымаў яшчэ 10-га сакавіка, але да сёньняшняга дня нічога практычнага яшчэ не зрабіў.

Нічога на робіцца по выпучэньні старых калгасьнікаў для перадачы вопыту новым калгасам. Толькі ў чатырох калгасах раёну гэтымі днямі распачалі праводзіць сыпучэньні.

Ян.

Новыя

Сваячасова падрыхтавацца да сплаву

Загатоўку і вывазку лесу— на баявыя рэйкі

Калгасы „ЧЫРВОНАЯ ГОРКА“ і ІМЯ ВАРАШЫЛАВА, Полацкага раёну, паказваюць сацыялістычныя мэтады працы на лесазагатоўках

Бязьлітасная вайна апартуністам, якія зрываюць падрыхтоўку да сплаву

Раўняйцеся па калгасах „Чырвоная горка“ і імя Варашылава—

ЯНЫ ПАКАЗАЛІ ЛЕПШЫ ПРЫКЛАД УДЗЕЛУ У ЛЕСАЗАГАТОУКАХ

ПОЛАЦАК. (Наш кар.).

Пашыраны пленум СЯСТРОНСКАГА сельсавету арганізаваў масавыя ўдарныя суботнікі па вывазцы песаматар'ялу і выклікаў на сацспаборніцтва па загатоўках лесу БЕЛЬСКІ І БУЛАЎСКІ сельсаветы.

Па Юравіцкім і Булаўскім сельсаветах таксама былі арганізаваны суботнікі па ліквідацыі прарываў на фронце лесазагатовак.

Сход бяднаты і жанчын пункту АРЦЕЙКАВІЧЫ выклікаў на сацспаборніцтва па ліквідацыі прарываў на лесазагатоўчым фронце КАЛГАСЫ «ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ», ІМЯ ВАРАШЫЛАВА, ПУНКТ ВАЛЬКОЎШЧЫНА І В. ВЗЬМІТРАЎШЧЫНА І ХРАПАЎШЧЫНА (Сястронскага сельсавету).

Калгас «НОВЫ ШЛЯХ» абвясьціў сябе ўдарным па вывазцы экспартна-будаўнічай драўніны і выклікаў пасьледаваць яго прыкладу калгасы «ЗОЛАК», «БАРАЦЬБА» і «ЧЫРВОНАЯ ДУБРОВА».

У адказ на гэты выклік КАЛГАС «ЧЫРВОНАЯ ДУБРОВА» абвясьціў сябе ўдарным і АБАВЯЗАЎСЯ АДПРАЦАВАЦЬ НА ЛЕСАВЫВАЗКАХ 15 ДЗЁН. У сваю чаргу калгас выклікаў пасьледаваць гэтаму прыкладу СМАЛАКУРАНУЮ АРЦЕЛЬ Сампрамсаюзу.

ГОНТАВАЯ АРЦЕЛЬ таксама прыняла выклік і абавязалася вылучыць на лесазагатоўкі кожны тыдзень па 40 фурманак. Многія члены арцелі абвясьцілі сябе ўдарнікамі па лесавывазцы.

Можна спадзявацца, што лесазагатоўкі па Полаччыне, дзякуючы сацыялістычным мэтадам працы, будуць выкананы да вызначанага тэрміну.

Веснавы сплаў Полаччына павінна сустрэць ва ўсеўзброенні.

НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ Ў ЛЕСАЗАГАТОЎКАХ ІДУЦЬ КАЛГАСЫ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА (Юравіцкі сельсавет) і «ЧЫРВОНАЯ ГОРКА» (Булаўскі сельсавет). Члены гэтых калгасаў бязупынна працуюць на лесазагатоўках, за што і прэміюцца прамтаварамі. ГЭТЫЯ КАЛГАСЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ ПРЫКЛАДАМ ДЛЯ ЎСІХ КАЛГАСАЎ, ЯКІЯ ЯШЧЭ НЕ ДАБІЛІСЯ НАЛЕЖНАГА ПЕРАЛОМУ Ў ЗАГАТОЎКАХ.

Мабілізацыяй усіх сіл і сродкаў ліквідуем прарывы на лесазагатоўчым фронце.

А. П.

Копыскі РВК „канстатуе факты“

КОПЫСЬ. (Брыгада «Зьвязды»).

Па Старасельскім сельсавеце лесазагатоўкі праходзяць надзвычай марудна. На 20 сакавіка плян выкананы усяго на 23 проц. Дакладнага пляну і ўліку гэтай работы ў сельсавеце няма.

Кулацка-заможныя гаспадаркі злосна ня выконваюць нарадаў па вывазцы лесу і вядуць шкёдную агітацыю супроць лесазагатовак, распускаючы розныя хлусьлівыя чуткі.

Райвыканком вельмі слаба цікавіцца лесазагатоўкамі. За ўвесь час райвыканком толькі адзін раз прыслаў камісію па гэтым пытаньні. Але і гэта камісія статавала, што «лесазагатоўкі ў вас нічога канкрэтнага не дала і нічым не дапамагла ў рабоце. Яна толькі канстатуе факты».

Апэрацыйная зводка падрыхтоўкі да сплаву

Паводле даных Лесбелу на 21 сакавіка плян лесазагатовак па леспрамгасах БССР выкананы: па дзелавой драўніне — на 97,4 проц., па дрывах — на 38,7 проц. Вывезена: дзелавой драўніны—59,1 проц., дроў — 57,6 проц.

Недапушчальна слабыя тэмпы загатовак дроў і вывазкі лесу тлумачацца тым, што некаторыя леспрамгасы недаацэньваюць значэньня гэтай работы. Замест практычных мерапрыемстваў па фарсаваньні загатовак і вывазкі яны апартуністычна бязьдзейнічаюць і спадзяюцца выключна на самацёк.

У той час, як некаторыя леспрамгасы са праўды бальшавіцкай работай дабіліся ня толькі выкананьня, але і перавыкананьня сваіх заданьняў (Маріінскі леспрамгас — 122,7 проц., Слуцкі—102,2 проц.), рад леспрамгасаў ганебна цягнуцца ў хвасьце. Так, Тураўскі леспрамгас выканаў плян загатоўкі дроў толькі на 8,9 проц., вывазкі — на 22,1 проц.; Хойніцкі па загатоўках дроў — 6,3 проц.; па вывазцы — 41,9 проц.; Асіповіцкі па загатоўках — 11,2 проц., па вывазцы — 34,1 проц.; Бярэзінскі па загатоўках — 12,2 проц., па вывазцы—42,9 проц.; Глускі па загатоўках — 12 проц., па вывазцы — 25,2 проц.; Лельчыцкі па загатоўках — 12,7 проц., па вывазцы — 34,5 проц

Гэтай недапушчальнай бязьдзейнасьці трэба пакласьці канец. Леспрамгасы павінны пераключыцца на сапраўды баявыя тэмпы работы. Вінаватых у зрыве загатовак і вывазкі лесу трэба крыцягнуць да адказнасьці.

Суботнік па ліквідацыі прарыву

РАСНА. (Наш кар.).

Расьнянская раённая партарганізацыя разам з камсамолам і калгасным актывам арганізавала 22 сакавіка суботнік па ліквідацыі прарыву па лесазагатоўках.

У часе суботніка было вырашана звыш 250 кубамэтраў дзелавой драўніны і дроў. На грошы, атрыманыя ад суботніка, будуць набыты акцыі Трактарацэнтру.

З лістоў рабселькораў

ДАПАМАГЧЫ КАЛГАСУ «БАЛЬШАВІК»

Яшчэ ў мінулым годзе Смалявіцкі райкамбінат перадаў калгасу «Бальшавік» валяныя млыны. Зараз райвыканком патрабуе ад калгасу 6 тыс. руб. за рамонт млыну, зроблены... у 1929 годзе, хоць райкамбінат карыстаўся млынам 4 гады і за ўвесь час рамантаваў яго адзін раз. Калгас ня можа адразу заплаціць такую суму. Райвыканком павінен дапамагчы калгасу і не патрабаваць ад яго выплаты такой вялікай сумы.

БЯРОЗКА.

СПАГНАЦЬ ЗАКАНТРАКТАВАНАЕ ЗБОЖЖА

Лельчыцкае райспажтаварыства нічога не зрабіла, каб спагнаць паводле дагавораў закантрактаванае збожжа і малако. Інструктар арганізацыі — Яроме ня прымае мер, каб дагавары былі выкананы. Бязьдзейнічае таксама і праўленьне спажтаварыства.

ПРАЕЖДЖЫ.

АБ ЛЕСАЎПАРАДКАВАНЬНІ ЗАБЫЛІ

Справа ўпарадкаваньня лясоў мясцовага значэньня па БССР у западзе. Лесазабяздпаньне і райвыканкомы гэтым усім не займаюцца. Калгасы і сельсаветы чакаюць плянаў і дырэктыў, як карыстацца сваім лесам. Са студзеня тэхнікам па лесаўпарадкаваньні не плацілі пэнсіі.

М.

НЯ ЗБІРАЮЦЬ ПОПЕЛУ

У Камвузе імя Леніна ня збіраецца попел. Гаспадарчая частка Камвузу спасылаецца на тое, што «ніхто ня хоча яго браць». Наўрад ці хоць адзін калгас або саўгас адмовіцца ад попелу. Нельга марна зьнішчаць каштоўнае ўгнаеньне.

С-ко.

УПАРТЫЯ КІРАЎНІКІ

Кіраўніцтва млыну на ст. Прыяміна, які належыць калгасу «Чыгуначнік», увесь час адмаўляецца дапамагчы лясному складу 4-га загатоўчага вучастку «Сэвбелтрансліса» распіліць лесаматар'ялы (млын з цыркулярнай устаноўкай) Млын-жа працуе з вялікай недагрузкай, а склад зараз у бязвыходным становішчы, бо для расьпілоўкі патрэбна шмат рабочых.

Гушчанка і Ваўранюк.

АПАРТУНІСТЫЧНАЯ РАБОТА КЛЁТЧЫНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ

Зусім дрэнна працуе Клётчынскі сельсавет, Вульскага раёну. Загатоўка і вывазка лесу зрываюцца. Загатоўка ільну выкананa ўсяго на 26 проц. Цьвёрдыя заданьні да кулацкіх гаспадарак не даведзены.

Старшыня сельсавету Балашчанка на кожным пасяджэньні сельсавету заяўляе, што ён ня хоча быць старшынём сельсавету.

Партыйная і камсамольская ячэйкі не рэагуюць на гэтыя факты.

М-ні.

ЗРЫВАЮЦЬ ВЫВАЗКУ ЛЕСУ

Нічога ня робіць Капыльскі месцачковы савет па вывазцы лесу. Заданьні па вывазцы ня выконваюцца. Кулакі ня выконваюць цьвёрдых заданьняў. Саўгас Цімкавічы мае 100 рабочых коняй, а на вывазку пасылае двух.

Вока.

ЗЛОМІМ КУЛАЦКІ САБАТАЖ

(Ад нашага карэспандэнта)

План загатовак і вывазкі лесу па ГАТАЎСКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ — пад пагрозай зрыву. На сёмешні дзень плян вывазкі выкананы усяго на 20-25 проц. Асноўнай прычынай зрыву гэтай важнейшай кампаніі зьяўляецца кулацкая агітацыя супроць загатовак і вывазкі лесу. Гэта зусім выразна выявілася НА ПАКАЗАЛЬНЫМ СУДЗЕ НАД ТРЫМА КУЛАКАМІ, ЯКІ НЯДАЎНА АДБЫЎСЯ Ў В. ГАТАВЕ.

Кулакі САДОЎСКІ МІХАСЬ, КЛАЧОК ЯЎХІМ і МІРОНЧЫК МІХАСЬ вялі шалёную агітацыю супроць мерапрыемстваў партыі і савецкай улады. Кулак САДОЎСКІ—у мінулым царкоўны старраста — распускаў чуткі аб тым, што выкананьне лесазагатовак і наогул усіх загатовак не абавязкова, што сьпілшацца з вывазкай лесу няма чаго. Рашуча адмаўляючыся выканаць сваё заданьне па вывазцы, ён угаворваў бедняковую і сераднякоўскую таксама адмовіцца ад гэтай работы. Некалькі раз ён ашукаў членаў сельсавету, заявіўшы ім, што запрагае каня і едзе ў лес, на справе-ж ён езьдзіў у Менск спэкулявць прадуктамі.

Каб не сварыстоўваць свайго каня для лесавывазак, Садоўскі наўмысьна купіў за 40 рублёў зусім нягоднага каня і калі ён аднойчы выехаў у лес, дык адвёз толькі адно бервяно таўшчынёю ў 12 см.

Кулак КЛАЧОК ЯЎХІМ пры белапольскай акупацыі быў старастам вёсні. Ён разам з палякамі рабаваў насельніцтва, рабіў вобыскі ў партызанаў. Клачок распускаў чуткі сярод сялян, што вясной прыедуць паляхі і павесяць усіх камуністаў і партызанаў. Калі сельсавет запрапанаваў яму выехаць у лес, ён кажгарычна адмовіўся, заявіўшы:

— Я Ў ЛЕС НЕ ПАЕДУ, ВЫ МНЕ НІЧОГА НЯ ЗРОБІЦЕ, Я ВАС НЕ БАЮСЯ.

Прыкладу Садоўскага і Клочка пасьледаваў і кулак МІРОНЧЫК. Ён таксама купіў спэцыяльна для лесавывазак за 30 руб. зусім нягоднага каня. Ён заўсёды ныў з бедняковай і сераднякоўй, якія, разумеючы важнасьць лесазагатовак, выконвалі свае абавязкі перад дзяржавай.

У хаце Мірончыка часта зьбіраліся кулацкія сходы, дзе абгаворваліся пытаньні, як сарваць лесазагатоўкі і інш. кампаніі, якія праводзяцца савецкай уладай.

Некаторыя члены сельсавету патуралі кулаком замест таго, каб даць ім рашучы адпор. Так, член сельсавету ГАРНАШЭВІЧ, які атрымаў грошы спэцыяльна для лесазагатовак, нічога не рабіў у гэтым напрамку і займаўся выключна п'янствам. Тое самае рабіў і другі член сельсавету ЛАЗАРЧЫК Сымон. Партыйная ячэйка і сельсавет не рэагавалі на гэтыя факты і да апошняга часу не заўважвалі кулацкай агітацыі.

СУД ПРЫГАВАРЫЎ КУЛАКОЎ САДОЎСКАГА МІХАСЯ І КЛАЧКА ЯЎХІМА ЗА АГІТАЦЫЮ СУПРОЦЬ ЛЕСАЗАГАТОВАК І ЗА КОНТР - РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ ВЫЛАЗКІ ДА ПАЗБАЎЛЕНЬНЯ ВОЛІ ТЭРМІНАМ НА ПАЎТАРО ГОДА КОЖНАГА З ПАРАЖЭНЬНЕМ У ПРАВОХ ПАСЬЛЯ АДБЫЦЬЦЯ ПАКАРАНЬНЯ ТЭРМІНАМ НА 2 ГАДЫ.

МІРОНЧЫК МІХАСЬ ПРЫГАВОРАН ДА 3-Х МЕСЯЦАЎ ПАЗБАЎЛЕНЬНЯ ВОЛІ.

Члены Гатаўскага сельсавету ГАРНАШЭВІЧ І ЛАЗАРЧЫК прыцягваюцца да судовай адказнасьці.

Ш. МУРОХ.

Зьезд рабочых жывёла гадоўчых саўгасаў

24 сакавіка ў Доме Працасьветы адкрыўся першы ўсебеларускі зьезд рабочых жывёлагадоўчых саўгасаў.

Зьезд віталі ад ЦК КП(б)Б — тав. ГАРУНОВІЧ, ад ЦК саюзу сельгаспрацоўнікаў СССР — тав. ВІНАКУРАВА, прадстаўнік падшэфнага палка і г. д.

У рабоце зьезду прымаюць удзел каля 100 дэлегатаў. Зьезд абгаворыць наступныя пытаньні: аб разбудаваньні саюзу ў сувязі з пастановай апошняга пленуму УсеЦСПС, далейшыя задачы саюзу, даклад Белсаўгастрэсту і інш.

У атаку за лён

СЁНЕШНІЯ ТЭМПЫ ЗАГАТОВАК пагражаюць зрывам кампаніі

„Аб'ектыўныя“ прычыны апартуністычная стаўка на самацёк, патураньні кулацка-заможным элемэнтам

„Лічыць зусім недапушчальнымі ўсякія разважаньні аб перавылічэньні пляну ільназагатовак, немагчымасьці яго выкананьня і вінаватых прыцягваць да адказнасьці“ (з пастановы бюро ЦК КП(б)Б).

Ільназагатоўкі--пад пагрозай

Апошнія даныя аб ходзе ільназагатовак паказваюць, што да гэтага часу яшчэ няма належнага пералому ў гэтай важнейшай кампаніі. МЕСЯЧНІК па ліквідацыі прарываў ва многіх раёнах праходзіць ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА.

Шматлікія сыгналы друку аб рэальнай пагрозе на фронце ільназагатовак многімі раённымі арганізацыямі ня ўлічаны. Праваапартуністычная практыка некаторых загатоўшчыкаў, памножаная на бязьдзейнасьць раду кіруючых раённых арганізацый, прыводзіць да таго, што ільназагатоўчыя пляны сыстематычна ня выконваюцца. Даволі сказаць, што ПА РАДЗЕ РАЁНАЎ за час з 15 да 20 сакавіка НЕ ЗАГАТОЎЛЕНА НІВОДНАГА ЦЭНТНЭРА ІЛЬНУ. Да гэтых раёнаў адносяцца БЯРЭЗІНСКІ, ВУЛЬСКІ, ВУШАЦКІ, ЗАСЛАЎСКІ, КАМАРЫНСКІ, ЛОЕЎСКІ, ПАРЫЦКІ, ТУРАЎСКІ, ВУЗЬДЗЕНСКІ, ХОЦІМСКІ, ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКІ, ЧАВУСКІ і ЧАЧАВІЦКІ. Некаторыя раённыя арганізацыі за гэтую пяціднёўку далі зусім мізэрныя лічбы загатовак. Так, па ЖЫТКАВІЦКІМ раёне за 5 дзён загатоўлена 1,2 цэнтнэра ільнавалакна, ДРЫСЕНСКІМ—2 цэнтн., ДРЫБІНСКІМ—0,3 цэнтн., БЯГОМЛЬСКІМ—1 цэнтн., КАСЬЦЮКОВІЦКІМ—3 цэнтн., ЧЫРВОНАПОЛЬСКІМ—2,2 цэнтн. і г. д.

Кулакі злосна сабатуюць здачу ільну, а некаторыя раённыя арганізацыі (сьвіслацкія, рэчыцкія, касьцюковіцкія, талочынскія і інш.) праяўляюць недапушчальную літасьць да кулацка-заможных гаспадараў, не прымушаюць іх выканаць цьвёрдыя заданьні.

ПА БССР НА 20 САКАВІКА ПЛЯН ВЫКАНАН УСЯГО НА 37,7 ПРОЦ. Між тым, загатоўкі павінны былі ДА 1 красавіка поўнасьцю скончыцца.

Патрэбны самыя рашучыя меры. Ва што-б там ні стала плян ільназагатовак павінен быць выкананы НА УСЕ 100 ПРОЦ. Вакол гэтай задачы трэба мабілізаваць усю грамадзкасьць. Раённыя партыйныя, прафэсыянальныя і савецкія арганізацыі павінны зараз-жа ўзяцца за гэту справу. Загатоўчым арганізацыям трэба пераключыцца на бальшавіцкія тэмпы.

Чорная дошка раёнаў, якія ганебна правальваюць ільназагатоўкі

РАЁН	Процант выкананьня заданьня да 20-III
Чырвона-Слабодзкі	6,5
Мазырскі	8,3
Сьвіслацкі	10,4
Чачавіцкі	11,6
Юравіцкі	12,6
Дрыбінскі	11,8
Гомельскі	12,5
Парыцкі	10,8
Нараўлянскі	11,2
Рагачоўскі	12,9
Расьнянскі	13,1

ГАНЕБНА ЗЬНІЗІЛІ ТЭМПЫ

БЯГОМЛЬ. (Наш кар).

Пяціднёўка ад 15 па 20 сакавіка паказала ганебнае зьніжэньне тэмпаў ільназагатовак. За гэтую пяціднёўку загатоўлена ўсяго... 1 цэнтнэр ільнавалакна. Гадавы плян ад пачатку кампаніі выкананa на 35,8 проц.

Цягнуцца ў хвасьце

ПЯТРЫКОЎ. (Наш кар.).

Слабы ход ільназагатовак тлумачыцца выключна недапушчальнай пасыўнасьцю загатоўчых арганізацый. Так, сыстэма БЕЛІЛЬНАСАЮЗУ за час з 15 да 20 сакавіка не загатовіла ніводнага цэнтнэра ільну. Сыстэма БЕЛКААПСАЮЗУ дала толькі 2 цэнтнэры. Ня дзіва, што гадавы плян ільназагатовак ганебна зрываецца. На 20 сакавіка апошні выкананa толькі на 30,3 проц.

За пяціднёўку. ніводнага цэнтнэра

ЗАСЛАЎЕ. (Наш кар.).

Раённыя загатоўчыя арганізацыі ільтаральна бязьдзейнічаюць. З 15 па 20 сакавіка НЕ ЗАГАТОЎЛЕНА НІВОДНАГА ЦЭНТНЭРА ІЛЬНУ. Ад пачатку кампаніі выкананa ўсяго 33,6 проц. гадавога пляну.

ФАРСАВАЦЬ ЗАГАТОЎКІ

ЛЮБАНЬ. (Наш кар.).

Ільназагатоўкі па Любаньскім раёне праходзяць недапушчальна марудна. Ад пачатку кампаніі загатоўлена толькі 27,7 проц. гадавога пляну. Патрэбны рашучыя меры для фарсаваньня загатовак.

Па Савецкай Беларусі

Наладзіць работу таварыскіх судоў на транспарце

Упадак працоўнай дысцыпліны на транспарце набыў пагражаючыя размеры. У цэлым рядзе дырэктыў партыі і ўраду, накіраваных да аздараўленьня работы транспарту, аддаецца вельмі многа ўвагі узьняцьцю працоўнай дысцыпліны, прычым сярод мер спагнаньня супроць дэзарганізатараў вытворчасьці правалочнае значэньне маюць мэтады агульна - выхаваўчага ўзьдзеяньня. У гэтым напрамку выключную ролю набывае работа таварыскіх судоў на транспарце.

Да гэтага часу, аднак, таварыскія суды не занялі належнага месца ў вытворчым жыцьці транспартных прадпрыемстваў, а месцамі яны зусім бязьдзейнічаюць.

Галоўнай прычынай гэтага зьяўляецца тое, што адміністрацыя і прафэтарганізацыі не аддаюць патрэбнай увагі работе таварыскіх судоў, пакідаючы іх амаль бяз усякага кіраўніцтва. Апрача таго, да гэтага часу законам не рэгламэнтавана дзейнасьць таварыскіх судоў у галіне вырашэньня спраў аб парушэньнях працоўнай дысцыпліны; дзейнае палажэньне аб таварыскіх судох ад 17-I 1930 г. не прадугледжвае разгляду гэтых спраў.

У лістападзе мінулага году на разглядзе ЦВК БССР уносена новае палажэньне аб таварыскіх судох, згодна якога апошнія будуць займацца пытаньнямі працдысцыпліны, адпаведна з гэтым пашыраюцца іх правы ў галіне ўжываньня мер спагнаньня. Гэта палажэньне, на жаль, не зацьверджана да гэтага часу, што і дае повад паасобным народным судом рашуча выказацца супроць разгляду таварыскімі судамі гэтай катэгорыі спраў. Ці трэба даказваць, што гэта пазыцыя народных судоў глыбока фармальная і яўна разыходзіцца з дырэктывамі партыі аб транспарце; між тым яна (пазыцыя), зьяўляючыся абавязковай на законе для таварыскіх судоў, уносіць вялікую дэзарганізацыю ў іх работу.

Выданае УсеЦСПС палажэньне аб вытворча - таварыскіх судох ад 9-IX 1930 г. унесла большую блытаніну ў гэта пытаньне, бо работнікі на месцах як судовыя, так і прафэсэюзныя ня могуць устанавіць грані паміж гэтымі двума органамі; іменна таму на многіх прадпрыемствах устрымліваюцца ад выбраньня вытворчых таварыскіх судоў, каб не ствараць паралелізму ў рабоце двух паасобных на сутнасьці арганізацый; на тых-жа прадпрыемствах, дзе паралельнае існаваньне такавых у цяперашні час ужо мае месца, работнікі гэтых судоў прышлі да вываду аб неабходнасьці зьліцьця гэтых органаў (нарада членаў таварыскіх судоў, якая гэтымі днямі адбылася ў Гомелі). Удзельнікі гэтай нарады асабліва асуджалі довады паасобных прафработнікаў супроць зьліцьця, якія бяцца, каб «дробныя бытавыя» справы не адцягвалі ўвагі таварыскіх судоў ад выкананьня задач па ўмацаваньні працдысцыпліны. Нерэзонасьць гэтых довадаў становіцца відавочнай, калі ўлічыць, што апошнія дырэктывы партыі абавязваюць прафсаюзы аддаць асаблівую увагу бытавым умовам жыцьця кожнага працоўнага, а таварыскія-ж суды па сутнасьці ёсьць органы прафарганізацый і, значыцца, не павінны застацца ў баку ад гэтых задач прафсаюзаў. І такім іменна парадку вырашылася пытаньне на Украіне, дзе НКЮ і УсеЦСПС выдалі супольны цыркуляр ад 30-I 1931 г. аб устанаўленьні на транспарце «аднаго таварыскага суда», які і вырашае ўсё пытаньні вытворчага характару.

Такую-ж, як відаць, пазыцыю заняў у гэтым пытаньні і Вярхоўны суд БССР, надаўшы на разгляд ЦВК адзначанае вышэй палажэньне аб таварыскіх судох. Трэба толькі паскорыць прахаджэньне гэтага закону ў законадаўчых інстанцыях, каб зьніжыць ведамственную каніцель і тым самым стварыць нармальныя ўмовы для плённай работы таварыскіх судоў у галіне ўзьняцьця працоўнай дысцыпліны.

М. КАМІНЭР.

За падпал калгасу — расстрэл

КЛІМАВІЧЫ. (Наш кар.). 18-го сакавіка вынесла сэсія Вярхоўнага суда БССР, пад старшынствам тав. Інсарова, слухала справу кулакоў, якія падпалілі калгас «Камунар».

Кулакі Асмалоўскі Павал і Асмалоўскі Александар прыгавораны да вышэйшай меры сацыяльнай абароны — расстрэлу з канфіскацыяй усёй маемасьці.

Чыж Павал і Чыж Аркадзь пазбаўлены волі тэрмінам на 8 год кожны; пасьля адбыцьця пакараньня яны будуць высланы за межы БССР на 5 год.

Асмалоўскі Апанас і Асмалоўская Натальля прыгавораны да 5 год пазбаўленьня волі і да 3 год высылкі. Асмалоўская Ефрасіньня пазбаўлена волі на 3 гады, Асмалоўская Пятрунэля і Дзябой Мікола — па адзін год кожны.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр
Сёньня адкрыты спэктакль
ПЕРШАЯ КОННАЯ
Пачатак у 8 гадз. вечр.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“
Звыш праграмы: СУД ІДЗЕ справа ЦК РСДРП (меншавікоў).
Пачат.: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м.
КАСА—з 5 гадз.

Кіно-тэатр „Культура“
Замежны фільм «ПОРТЫ»
Звыш праграмы: СУД ІДЗЕ справа ЦК РСДРП (меншавікоў).
Пачатак: 7 г., 8 г. 45 м. і 10 г. 30 м.
КАСА—з 5 гадз.

Кіно „Інтэрнацыянал“
Замежны фільм
СКРЫПАЧ з ФЛЁРЭНЦЫІ
Пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз.
Каса з 4 г. 30 м.

КІНО „Пралетары“
Сучасная бытавая драма
РАЗВОД у 7 частках
Звыш праграмы—хроніка Саюзкіно №8.
Пач. 1 сэансу ў 6 г. Каса—з 4 гадз.

КІНО „Юны Піянэр“
Мастацкі фільм
ЗАКОН ГОР драма ў 8 частках.
Пачатак сэансу ў 1 гадз. дня.
Каса—з 12 г. дня.

КІНО „Спартак“
ТАРАС ТРАСІЛА
Трагедыя ў 7 частках.
Пач. у 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м.
Каса—з 5 гадз.

МЕНСКАЯ ГАРАДЗКАЯ АШЧАДКАСА
ПРАПАНУЕ
ўсім прадпрыемствам і ўстановам гор. Менску, якія правядзілі падпіску на пазыку ў ашчадкасах гор. Менску — у тэрміновым парадку —
зьявіцца ў ашчадкасы для атрыманьня замацавальных талёнаў пазыкі
„ПЯЦІГОДКА за 4 гады“ да 1 красавіка 1931 г.
Асабістая адказнасьць за своечасовае атрыманьне замацавальных талёнаў укладаецца на кіраўнікоў прадпрыемстваў і устаноў. У выпадку несвачасовага атрыманьня замацавальных талёнаў, падпісчыкі будуць пазбаўлены магчымасьці ўдзельнічаць
8 красавіка ў першым тыражы.
Менская гарадзкая ашчадная каса.

1-ы Усебеларускі Зьезд рацыяналізатараў і рабочых-вынаходнікаў — ударнікаў і прадстаўнікоў АТК
ПРЫЗНАЧАНЫ НА 29 САКАВІКА
адкладваецца на 20 красавіка
ЦСНГБ

Полацкі лясны тэхнікум
паведамляе ўсіх студэнтоў тэхнікуму, мабілізаваных на лесазагатоўкі, што згодна тэлеграмы «Союзлеспрома» ад 26-га сакавіка тэрмін працы іх на лесазагатоўках працягнут да 15 красавіка.
З 15-IV на 1-V—канікулы. На завяткі ў тэхнікум павінны зьявіцца 1 мая 1931 году без спазьненьня.
Дырэктар тэхнікуму ВЕЛОВІЧ.

Праўленьне МЦРК
папярэджвае ўсіх грамадзян гор. Менску, якія яшчэ не атрымалі новых наборных картак, што АБМЕН будзе рабіцца, выключна ў стале найшыкаў (Калініна, 5), толькі да 1-го красавіка 1931 г.
Пасьля гэтага абмен спыняецца.
Тому ўсе грамадзяне, не атрымаўшыя картак, павінны іх атрымаць да 1-IV 1931 г.
Праўленьне МЦРК.

З 23-III прыступіла да працы камісія па праверцы і
ЧЫСТЦЫ апарату Белдзяржкіно.
Просьба да ўсяго пралетарскае грамадзкасьці даваць матар'ял, як па працы апарату Белкіно, так і на асобных яго працаўніковў па адрасе: Менск, Савецкая, 90, камісіі па чыстцы.

АДДЗЕЛ РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ дэфіцытных тавараў МЦРК
(Савецкая, 64)
даводзіць да ведама каапупаўнаважаных, што з 26 сакавіка пачнецца выдача талёнаў на рамонт абутку.
ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА, ШТО
РАЁННАЯ КАМІСІЯ ПА БАРАЦЬБЕ З ПАВОДКАЙ ТАТАРСКАГА РАЁНУ
ПЕРАМЯСЬЦІЛАСЯ
з Лямцавай фабрыкі на Стара-Віленскую вул., № 13 у памяшканьне канцылярыі ЖАКТу № 22, тэл. № 8-36 два званкі.
КАМІСІЯ ПА БАРАЦЬБЕ З ПАВОДКАЙ.

БЕЛІЛЬНАСАЮЗУ
ТЭРМІНОВА ПАТРЭБНЫ
ТЭХНІК-БУДАЎНІК і ІНЖЫНЭР-БУДАЎНІК.
АКЛАД ПЭНСІІ ПА ЗГОДЗЕ.
Дапускаецца сумяшчэньне за асобную плату.
Праўленьне.

Бюро завочнага навучаньня сэктару прамкадраў ВСНГБ
абвяшчае
ПРЫЁМ СЛУХАЧОЎ-ЗАВОЧНІКАЎ
ў наступныя навучальныя ўстановы:
Хэміка - тэхналёгічны інстытут—Менск
па аддзяленьні асноўнай хэміі і грубай керамікі.
Хэм ка-тэхналёгічны тэхнікум—Менск
па тарфяным аддзяленьні.
Архітэктурна-будаўнічы тэхнікум.
Правілы прыёму можна атрымаць у вышэйпаказаных навучальных установах і па ўсіх прадпрыемствах і абʼяднаньнях ВСНГ БССР.
Прыём заяў з 1-га красавіка 1931 г.
Бюро завочнага навучаньня сэктару прамкадраў ВСНГБ СР

ТРЭСТ СЬВІНАВОД
у гор. Менску
АДКРЫВАЕ КУРСЫ
для падрыхтоўкі старшых бухгальтароў і бухгальтароў, для работы ў беларускіх саўгасах трэсту.
Прыймаюцца слухачы з моманту прыёму да 1-V—31 г. праходзяць вытворчую практыку ў саўгасах і пасьля гэтага праходзяць 4-х месячны курс тэарэтычнага навучаньня ў гор. Менску.
УМОВЫ ПРЫЁМУ:
а) За час вытворчай практыкі і тэарэтычнай падрыхтоўкі слухачы забясьпечваюцца стыпэндыяй у разьмеры 120 руб. у месяц.
б) Слухачы інтэрнатамі не забясьпечваюцца, а замест гэтага выплачваюцца квартэрныя грошы за рахунак трэсту ў разьмеры да 10 руб. у месяц.
в) Па скончэньні курсаў слухачы павінны прапрацаваць у саўгасах Сьвінавода на меншы двух год на пасадзе старшага бухгальтара, або мак. ст. бухгальтара з акладам ад 150 да 200 руб. у месяц, пры дармовых камунальных паслугах.
г) Слухачом аплачваюцца ўсе фактычныя выдаткі, зьвязаныя з пераездам ад Менску да саўгасу і назад.
д) На курсы прымаюцца асобы ва ўзросьце да 40 год, якія маюць на меншы двухгадовага стажу на пасадзе бухгальтара, а рахункавода—4—5 год. Для членаў КП(б)Б і ЛКСМ патрабаваньні могуць быць зьмякчаны.
е) Заяву з прыкладаньнем: засьведчанай копіі працоўнага сьпісу; даведкі аб сацыяльным становішчы і паходжаньні, даведкі аб парт. і праф. прыналежнасьці трэба накіроўваць у Беларускую кантору трэсту Сьвінавод па адрасе: г. Менск. Савецкая, 70
СЭКТАР КАДРАЎ.

ГАДАВАЛЬНІК КУПЛЯЕ САБАК
нямецкіх аўчараў і „добермэнтрычкер“. Прапановы па тэлефоне 8-01 ад 9 да 17 г. штодзённа.

Зьбегла аўчарка нямецкай пароды, кабель-клічка „Тарзан“
Прашу павядоміць па адрасе: 2-й Безымянны зак. (вяла Заводзкой Горкі), дом № 5-10 кв., 2 ГРЫНКЕВІЧ. К. За ўтойванье буду прасьледаваць па законе.

ПАСТАНОВА № 5

прэзыдыуму менскага гарадзкога савету рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў.

г. Менск 23 сакавіка 1931 году

На падставе пастановы СНК СССР ад 28-II—1931 г. і пастановы СНК БССР ад 3-III—1931 г. («Сав. Беларусь» № 55-3144—1931 г.)

пра перарэгістрацыю гарадзкога насельніцтва ў сувязі з выдачай адзінай наборнай кніжкі,

прэзыдыум менскага гарадзкога савету ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1) Перарэгістрацыю насельніцтва гораду Менску правесьці з 25 сакавіка па 31 сакавіка 1931 г.

2) Перарэгістрацыя праводзіцца шляхам абходу рэгістратарамі МЦРК самаўладаннаў і кватар.

Арганізацыйна-мэтадалёгічнае кіраўніцтва гэтай перарэгістрацыяй укладаецца на плянавую камісію Менгарсавету.

3) Перарэгістрацыі падлягае ўсё насельніцтва гор. Менску, незалежна ад права на атрыманьне наборнай кніжкі, а таксама і ўтое насельніцтва, якое пражывае за межамі г. Менску, але забясьпечваецца Менсэсім ЦРК.

Увага: Перарэгістрацыя насельніцтва, якое пражывае за межамі тэрыторыі гор Менску, праводзіцца пасьля скасаваньня я перарэгістрацыі па гораде з —1 красавіка па 10 красавіка 1931 году.

4) Абавязаць усіх грамадзян, домакіраўніцтвы і домаўласьнікаў даваць рэгістратарам адказы на ўсе запытаньні па перарэгістрацыі, а таксама прадстаўляць яму ўсе патрэбныя дакументы для правядзеньня перарэгістрацыі

5) Для правядзеньня перарэгістрацыі, у ЖАКТ'ах, камунальных домах, дзіцячых домах інтэрнацкага тыпу, папраўча - працоўных домах і г. д., домакіраўніцтвы і адміністрацыя гэтых устаноў павінны вылучыць асобных прадстаўнікоў для правядзеньня перарэгістрацыі пад кіраўніцтвам вучастковых бюро, якія будуць створаны пры адзначаных вышэй.

6) Усім дзяржаўным установам і службовым асобам прапануецца аказваць усякую дапамогу прадстаўнікам па правядзеньні перарэгістрацыі.

7) Інспэктарам асьветы і працы прыцягваць за ўдзелу ў правядзеньні перарэгістрацыі прадстаўнікоў устаноў, студэнтаў і вучняў з вызваленьнем іх на час працы па перарэгістрацыі ад выкананьня сваіх вытворчых іх аб